Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 ВЕРАСНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 173 (30307)

ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЭПУТАЦКАГА КОРПУСА 4

ЧАМУ ПАДЛЕТКІ ЗБЯГАЮЦЬ З ДОМУ

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ПАДДУБКА, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі:

«У мінулым годзе мы дэманстравалі наш эксперыментальны ўзор легкавога беларускага электрамабіля, створанага на базе серыйнага беларускага аўтамабіля Geely Coolray X50. Электрычная версія — EX50. Пасля паказу мы атрымалі даручэнне стварыць ужо перадсерыйную партыю з пяці штук, якая была б максімальна набліжана да серыйнага выпуску. На гэтай партыі мы праверым эфектыўнасць, эканамічную мэтазгоднасць і адпрацуем тэхналагічныя рашэнні. Цяпер мы якраз у працэсе іх стварэння — распрацавалі ўсе кампаненты электрапрывада, дакументацыю перадалі нашым прадпрыемствам-вытворцам. У найбліжэйшы час атрымаем гэтыя кампаненты і ў сябе збяром першы варыянт перадсерыйнага электрамабіля. А на працягу наступных месяцаў на прадпрыемстве «БЕЛДЖЫ» ўжо збяром усе пяць».

ТАЛЕНТ РЭЧЫЦКАГА КРАЮ

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Майстар народных мастацкіх рамёстваў дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкі цэнтр рамёстваў» Ніна Балдзенка — вядучы майстар саломапляцення. Яна развівае і папулярызуе старадаўні творчы кірунак — інкрустацыю саломкай, а таксама разнастайную мастацкую апрацоўку гэтага прыроднага матэрыялу. У аматарскім аб'яднанні «Народнае золата» майстар народных мастацкіх рамёстваў перадае свой досвед усім ахвотным і далучае іх да творчага працэсу.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

КАРАТКА

- **Доля анлайн-гандлю ў Беларусі вырасла да 8,1 %.**
- У літоўскім «Мядзінінкаі» за суткі аформілі 14 % фур ад нормы. Аб гэтым БелТА паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.
- **В'етнам папоўніў спіс пакупнікоў беларускага сухога малака праз БУТБ.**

ISSN 1990 — 763X

Сацыяльны аспект

ДРУГІ ДОМ

Студэнты Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта — пра засяленне і пражыванне ў інтэрнатах

Пачатак верасня для студэнцтва нашай краіны — гэта не толькі старт новага семестра, лекцыі, практычныя, лабараторныя заняткі. Гэта яшчэ і час засялення ў інтэрнаты для тых, хто прыехаў на вучобу з іншага горада альбо вёскі. Нярэдка гэты працэс выклікае хваляванні, асабліва ў першакурснікаў і іх бацькоў: якія там умовы, ці прымальны рэжым для вучобы і самападрыхтоўкі, ці пасябруе навaспечаны студэнт з таварышамі па пакоі. Старшакурснікі, вядома, адчуваюць сябе больш упэўнена. Прынамсі, пра гэта і не толькі карэспандэнт газеты распытала ў маладых людзей, якія нядаўна засяліліся ў інтэрнаты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Аляксандр Ішымаў.

СТАР. 3

Экаспадчына

МАРШРУТ ПА КРЫНІЧНЫМ КРАІ

Першымі яго пачалі асвойваць гродзенскія творцы

Не апошнюю ролю ў гэтай захапляльнай паездцы адыграла публікацыя ў газеце «Звязда». На яе старонках мы неаднойчы звяртаемся да тэмы захавання прыроднага багацця, у тым ліку крыніц Гродзенскай пушчы — помнікаў прыроды мясцовага значэння. Артыкул на гэту тэму зацікавіў гродзенскую творчую інтэлігенцыю, і многія захацелі праехаць па ўнікальных мясцінах. Паездка стала першай масавай экскурсіяй, арганізаванай гродзенскім творчым калектывам «Крыніца». Менавіта яго намаганнямі выйшлі з небыцця тыя самыя крыніцы. На энтузіястах трымаецца і арганізацыя крынічнага маршруту, які мае не толькі аздараўленчы кірунак, але і пазнавальны.

Фота Тамары МАЗУР.

СТАР. 13

Афіцыйна

Дзяржаўныя ўзнагароды і падзякі работнікам АПК

Адпаведныя ўказ і распараджэнне кіраўнік дзяржавы падпісаў 4 верасня, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта. За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў работнікам АПК прысвоены ордэн, медалі і падзякі.

Ордэна Пашаны ўдастоены галоўны аграном ААТ «Агра-Кобрынскае» Іван Гусак, медаля «За працоўныя заслугі» — дырэктар ААТ «Вазнясенскі» Жабінкаўскага раёна Надзея Кандрацюк, вадзіцель аўтамабіля ААТ «Дварэцкі» Лунінецкага раёна Уладзімір Кіндрук, трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці ААТ «Жарабковічы» Ляхавіцкага раёна Анатоль Петух.

Ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена старшыні сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Дарапеевічы» Васілю Юхімуку.

Падзякай Прэзідэнта ўганараваны старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Фядорскі» Столінскага раёна Мікалай Агафонаў, кіраўнік аддзялення «Своды» ААТ «Астрамечава» Брэсцкага раёна Фёдар Вабішчэвіч, трактарыст-машыніст ААТ «Агра-Моталь» Іванаўскага раёна Руслан Супрун і вадзіцель аўтамабіля аддзялення «Расна» «Белавежскі» Камянецкага раёна Сцяпан Царук.

Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб памілаванні асуджаных»

Кіраўніком дзяржавы памілаваны 30 асоб, асуджаных за злачынствы пратэснай накіраванасці.

Гэта рашэнне — гуманны жэст у адносінах да гэтых людзей. Яны атрымалі шанц вярнуцца да нармальнага жыцця, да сям'і і работы, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Сярод памілаваных — 7 жанчын і 23 мужчыны. Большасць асуджаных з'яўляюцца бацькамі непаўналетніх і малалетніх дзяцей. Усе прадстаўленыя да памілавання асобы былі разгледжаны камісіяй па вяртанні збеглых пад кіраўніцтвам Генеральнага пракурора Андрэя Шведа.

Усімі гэтымі асобамі выкананы абавязковыя ўмовы памілавання: яны падалі хадайніцтва аб памілаванні, прызналі віну, шчыра раскаяліся і далі абяцанне весці правапаслухмяны спосаб жыцця.

Кантроль за правапаслухмянымі паводзінамі вызваленых забяспечыць МУС.

Парламенцкі дзённік

«У НАС НЯМА НЕ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з дэпутацкім корпусам Віцебшчыны

Перад дыялогавай пляцоўкай з дэпутатамі паўночнага рэгіёна Старшыня Савета Рэспублікі наведала будынак былога Дома афіцэраў, у якім цяпер размяшчаецца ваенная кафедра і шэраг творчых спецыяльнасцяў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай. Сваю работу кафедра пачне з першага кастрычніка, усе аўдыторыі ўжо гатовы прымаць студэнтаў.

Падчас экскурсіі па новым корпусе рэктар універсітэта Юрый Раманоўскі адзначыў, што будынак быў перададзены ПДУ ў 2021 годзе. «Першага чэрвеня 2023-га пачаўся капітальны рамонт. Рэстаўрацыйныя і аднаўленчыя работы ажыццяўляліся ў тым ліку і да мерапрыемстваў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. На гэтай пляцоўцы адбылася секцыя па абмеркаванні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва як аднаго з важных напрамкаў развіцця Саюзнай дзяржавы. Мы разам зрабілі ўсё магчымае, каб гэты будынак стаў гістарычнай адметнасцю горада. Мы ўдзячныя Старшыні Савета Рэспублікі за дапамогу, таму што з яе падтрымкай мы змаглі рэалізаваць гэты маштабны праект», — расказаў рэктар.

Фота БелТА.

Дарэчы, помнік архітэктуры ў стылі сталінскага ампіру цяпер перажывае нават не другое, а, з улікам яго адраджэння пасля пажару падчас Вялікай Айчыннай вайны, трэцяе нараджэнне. Сёння тут чакаюць студэнтаў 16 аўдыторый, два камп'ютарныя класы, вялікая актавая зала — умовы для навучання камфортныя.

Адкрываючы сустрэчу з дэпутацкім корпусам, Наталля Качанава адзначыла, што 2024 год для нашай краіны асаблівы. «Гэта і электаральная кампанія, 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, год, калі ў многіх краінах свету праходзяць выбары: прэзідэнтаў і членаў парламентаў будуць выбіраць у больш чым 70 краінах свету. Ад вынікаў галасаванняў будзе залежаць жыццё каля 50 % насельніцтва Зямлі», — падкрэсліла спікер.

Спыняючыся на самай маштабнай электаральнай кампаніі ў гісторыі незалежнай Беларусі, Наталля Качанава нагадала, што ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй былі сфарміраваны ўсе структуры: ад сельскіх Саветаў да Палаты прадстаўнікоў. Абрана 12,6 тысячы дэпутатаў, з якіх 110 — дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, 12 514 — мясцовых Саветаў. «Мы захавалі сельскія Саветы, і я лічу, што гэта правільна. Калі ішла гаворка, патрэбныя ці не патрэбныя сельскія Саветы, кіраўнік дзяржавы нас падтрымаў: патрэбныя! Гэта тыя людзі, якія проста там, на месцах, працуюць з нашымі грамадзянамі. Яны бачаць, чым жывуць людзі, і даюць пастаяннае падсілкоўванне інфармацыяй мясцовым органам улады па пытаннях, якія павінны вырашацца на тым ці іншым этапе», — адзначыла Наталля Качанава.

Старшыня верхняй палаты парламента засяродзіла ўвагу прысутных на тым, што члены Савета Рэспублікі павінны кардынаваць работу з дэпутацкім корпусам. Вельмі важна, каб людзі на месцах гэта ведалі і ўносілі прапановы. «Прэзідэнт заўсёды кажа, што законы павінны быць ад зямлі, а гэта значыць, мы павінны разумець працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, і ў сувязі з гэтым ведаць, якія законапраекты сёння патрабуюць абнаўлення, карэкціроўкі», — сказала яна.

Час выбраў нас, і ад кожнага з нас залежыць будучыня нашай краіны, падкрэсліла спікер, звяртаючыся да дэпутатаў: «Ад кожнага! І калі вы сёння гэта глыбока ўсведамляеце і данесяце да кожнага члена свайго калектыву, гэта будзе правільна. Я вас вельмі прашу: не адмахвайцеся ад людзей, тых, хто жыве ў вёсках, у глыбінцы. Яны не павінны быць кінутыя. Мы павінны зрабіць так, каб у іх былі ўсе магчымасці атрымліваць медыцынскую дапамогу, адукацыю, каб працавалі гандаль і транспарт. Калі ёсць нейкае разумнае рашэнне ў праблемных момантах — прапаноўвайце! Паверце: Прэзідэнт заўсёды пагодзіцца з разумнымі і правільнымі прапановамі. Ён гэта адчувае ўнутрана. І тут такіх пытанняў быць не павінна. Я вас шчыра заклікаю да гэтага. Вы павінны быць сёння не проста назіральнікамі, а дзейнымі і актыўнымі ўдзельнікамі. Запомніце: у нас няма не нашых людзей — усе людзі нашы, і з усімі трэба працаваць», — заключыла Наталля Качанава.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

АЎТАРЫТЭТ ДЭПУТАТА — ГЭТА КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ

Ігар СЕРГЯЕНКА з рабочым візітам наведаў Гродна

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сустрэўся з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў ад Гродзенскай вобласці. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні ролі і месца дэпутацкага корпуса ў эканамічным і сацыяльна-палітычным развіцці рэгіёна. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўніцтва і члены Гродзенскага аблвыканкама.

Ігар Сергяенка адзначыў ініцыятыўную і плённую работу дэпутацкага корпуса, у якім Гродзеншчына прадстаўлена 13 дэпутатамі, трое з іх выбраны паўторна. Усе яны ўвахадзяць у склад 14 пастаянных камісій актыўна займаюцца заканатворчай дзейнасцю. Так, за перыяд работы першай сесіі падрыхтавана да разгляду 36 законапраектаў, з іх 16 законаў будзе разгледжана на чарговай, другой, сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая пачне сваю работу 17 верасня.

Ігар Сергяенка адзначыў важнасць удзелу дэпутацкага корпуса ў рабоце над Кодэксам аб адукацыі. Напрыклад, вядзецца актыўны маніторынг па пытаннях, якія былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы падчас Рэспубліканскага педагагічнага савета. Меркаванні педагогаў і грамадскасці па магчымых інавацыях, змяненнях, дапаўненнях будуць унесены ў Кодэкс аб адукацыі.

Важным аспектам дзейнасці дэпутатаў з'яўляецца іх работа ў сваіх выбарчых акругах. Як зазначыў Ігар Сергяенка, дэпутаты актыўна вядуць работу з насельніцтвам, па выніках якой рыхтуюць свае меркаванні па тых ці іншых пытаннях. Гэта датычыцца і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і транспартнага забеспячэння, і розных ініцыятыў у заканадаўстве.

Так, за паўгода дэпутаты ад Гродзенскай вобласці правялі амаль паўсотні сустрэч у працоўных калектывах, дзясяткі прамых ліній і выступленняў у СМІ. Дэпутаты ўдзельнічаюць у круглых сталах, дыялогавых пляцоўках, семінарах. Разам з выканаўчай уладай аператыўна вырашаюцца канкрэтныя праблемы грамадзян. Дэпутацкі корпус не на словах, а на справе садзейнічае эфектыўнаму развіццю рэгіёнаў.

— Мы абмеркавалі, як ідзе ўзаемадзеянне дэпутатаў з мясцовай выканаўчай уладай, бо працоўны дзень дэпутата ў акругах павінен пачынацца з планавання ў выканаўчым камітэце, у выніку якога праходзяць сустрэчы з насельніцтвам. Такім чынам дэпутат фарміруе свае меркаванні па тых ці іншых праблемах жыццезабеспячэння рэгіёна. Гэта датычыцца таксама ініцыятыў у заканадаўстве, з якімі могуць прыходзіць да дэпутата яго выбаршчыкі. Аўтарытэт народнага выбранніка складаецца менавіта з канкрэтных добрых спраў у сваіх акругах і іх адлюстравання ў сродках масавай інфармацыі. А патэнцыял парламентарыяў дазваляе знаходзіць новыя рэзервы ў гэтай стваральнай дзейнасці, — падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Па словах старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Караніка, у Гродзенскай вобласці выканаўчая і заканадаўчая ўлады працуюць у цесным узаемадзеянні. Дэпутаты ад рэгіёна карыстаюцца падтрымкай людзей і ведаюць, што адбываецца ў іх акругах і што хвалюе жыхароў.

Парламентарыі не толькі своечасова інфармуюць органы ўлады аб тых ці іншых праблемных пытаннях, але і прыкладаюць намаганні для іх сумеснага вырашэння. Няма ў вобласці такіх кірункаў дзейнасці, дзе б не было ўдзелу дэпутатаў. Не выключэнне і міжнароднае супрацоўніцтва, у прыватнасці расійска-беларускі форум малых гарадоў Саюзнай дзяржавы. Абласнымі ўладамі падтрымана і трансгранічнае супрацоўніцтва з Калінінградскай вобласцю, якое ажыццяўляецца па ініцыятыве дэпутатаў. Такім чынам, агульная канструктыўная работа выканаўчай улады і дэпутацкага корпуса спрыяе добрым станоўчым вынікам у рэгіянальным развіцці.

Фота БелТА.

Падчас рабочай паездкі ў Гродна старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з кіраўніцтвам і працоўным калектывам ААТ «Гроднажылбуд». Ён адзначыў, што Гродна расце і развіваецца дзякуючы, у тым ліку, і рабоце дадзенага, вядучага ў будаўнічай галіне, прадпрыемства. Будуюцца новыя мікрараёны, тым самым ствараюцца ўмовы для развіцця рэгіёна і ў цэлым краіны.

Адной з ключавых тэм сустрэчы на прадпрыемстве стала 30-годдзе інстытута Прэзідэнцтва ў Беларусі. Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу на тых дасягненнях, якіх дабілася краіна пасля татальнага эканамічнага крызісу. Літаральна за некалькі дзесяцігоддзяў Беларусь значна прасунулася ў атамнай, узнаўляльнай энергетыцы, біятэхналогіях, фармацэўтыцы, машына- і прыборабудаванні. Пад кіраўніцтвам Прэзідэнта ўдалося не толькі захаваць, але і мадэрнізаваць такія заводы-гіганты, як МАЗ, БЕЛАЗ, МТЗ і іншыя, стварыць высокатэхналагічныя вытворчасці. Беларусь займае лідзіруючыя пазіцыі па выпуску і экспарце малочнай прадукцыі. Айчынныя прадукты пастаўляюцца больш чым у 100 краін свету. Расце і дабрабыт насельніцтва. У краіне кожны трэці беларус мае ўласны аўтамабіль. Вялікая ўвага аддаецца жыллёваму забеспячэнню насельніцтва, якое ствараецца і сіламі прадпрыемства «Гроднажылбуд».

У рамках візіту старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама наведаў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт, дзе сустрэўся з адміністрацыяй і кіраўнікамі грамадскіх аб'яднанняў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ДРУГІ ДОМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дар'я Барысевіч — першакурсніца, вучыцца на архітэктурна-будаўнічым факультэце. Дзяўчына паспяхова скончыла чацвёртую школу горада Лунінца і паступіла на бюджэтную форму навучання. Яшчэ 30 жніўня навасцянаая студэнтка засялілася ў інтэрнат № 2, які, дарэчы, не так даўно перажыў капітальны рамонт.

— Наш інтэрнат блочнага тыпу, кожны блок складаецца з двух пакояў, у адным пражываем два, у другім тры чалавекі, — расказвае Даша. — Душ і санвузел у блоку, а кухня — па калідоры, і нам пашанцавала: ад нашага блока зусім недалёка. Пакой укамплектаваны мэбляй, усё патрэбнае ёсць: ложак, шафа, тумбачка, стол. А з арэндай халадзільніка дапамог прафкам. І гэта вельмі зручна: купляць не трэба, арэндная плата цалкам прымальная. Пакуль яшчэ ўсё не вывучылі, але ж ведаю, што на першым паверсе ёсць пакой для навучання накшталт невялікай чытальнай залы. Гэта значыць, што, напрыклад, у сесію можна будзе пасядзець гадзіну-другую.

Яшчэ Дар'я Барысевіч адзначыла як станоўчы факт, што пры засяленні ўлічылі і просьбы па пражыванні з сяброўкай. Дзяўчаты пазнаёміліся пры паступленні, вось іх і засялілі разам. Цяпер яны ўладкоўваюць побыт, упрыгожваюць пакой.

Яе цёзка **Дар'я Каспяровіч** вучыцца ўжо на чацвёртым курсе факультэта інжынерных сістэм і экалогіі. Актывістка, спартсменка, прыгажуня і, як высветлілася, выдатніца. Па выніках апошняй сесіі сярэдні бал дзяўчыны склаў «10». Даша родам з Івацэвічаў, у інтэрнаце жыла ўсе папярэднія гады. Сёлета дзяўчына працавала валанцёрам, дапамагала камісіі па засяленні ў інтэрнат. Сказала, што ў яе асабіста працэдура засялення заняла 10 хвілін, але ж прадказаць наплыў студэнтаў у асобныя дні бывае цяжка, таму здараюцца і чэргі, доўгае чаканне пры афармленні дакументаў. «Варта набрацца цярпення, гэта ж клопаты аднаго дня, можна і патрываць. Затое потым маеш месца ў інтэрнаце, за якое штомесяц уносіш сімвалічную аплату, бо зняць кватэру альбо нават пакой у Брэсце сёння каштуе зусім не танна», — разважае студэнтка.

Дар'я вельмі сур'ёзна падыходзіць да вучобы, займаецца навуковай і грамадскай работай і лічыць, што камфортнае пражыванне ў інтэрнаце спрыяе яе поспехам.

Аляксандр Ішымай, студэнт другога курса факультэта электронна-інфармацыйных сістэм, выдзяляецца дарослым стаўленнем да жыцця. За плячыма ў хлопца — вучоба ў Столінскім каледжы, работа, ён і цяпер пры любой магчымасці падпрацоўвае. Таксама займаецца спортам, наведвае секцыю армрэслінга, куды запісаўся, дарэчы, на другі дзень пасля засялення. «Вельмі зручна, што памяшканне, у якім праходзяць трэніроўкі, знаходзіцца ў інтэрнаце, тут жа ёсць і трэнажорная зала», — адзначыў ён.

Аляксандр расказаў, што перад паступленнем наведаў універсітэт падчас Дня адкрытых дзвярэй і падрабязна азнаёміўся

На вечары адпачынку ў інтэрнаце № 4.

з умовамі вучобы і пражывання: «Мне спадабаўся Брэст. У адрозненне ад сталіцы ён невялікі, кампактны, пры гэтым прыгожы, дагледжаны. Вельмі зручна, што тэрыторыя ўніверсітэта — вучэбныя карпусы і інтэрнаты — аб'яднаны ў адзін комплекс, усё побач і ў крокавай даступнасці магазіны, гандлёвыя цэнтры. У інтэрнаце ў нас парадак, чысціня, якую мы самі абавязаны падтрымліваць. Большасць маіх таварышаў па вучобе гэта разумеюць, таму асаблівых праблем не ўзнікае. У нас цудоўныя магчымасці для заняткаў спортам, секцыі на любы густ. Толькі не лянуйся — заўсёды будзеш у форме».



Вікторыя Грабінская.

Вікторыя Грабінская вучыцца на чацвёртым курсе эканамічнага факультэта. Яна прыехала з Драгічынскага раёна і цяпер жыве ў інтэрнаце пад нумарам «чатыры», таксама блочнага тыпу. Адной з пераваг пражывання ў ім Вікторыя як будучы эканаміст назвала зусім невялікую плату за пражыванне: «Мы плацім 32 рублі за месяц. А прафкам нават праводзіць розыгрыш на бясплатнае пражыванне на працягу семестра». Другім станоўчым момантам дзяўчына лічыць нясумнае жыццё: «У інтэрнаце праводзіцца шмат мерапрыемстваў. Асабліва цікава адзначаем дзень студэнта, розныя святы. Важна, што ў нас студэнт забяспечваецца месцам у інтэрнаце на ўвесь час вучобы. Мае аднакласнікі, што вучацца ў асобных ВНУ сталіцы, не могуць гэтым пахваліцца».

Вікторыя згадала, як на першым курсе хвалявалася яе мама перад пачаткам вучобы. А калі зайшла ў пакой пасля засялення, дык і ад сэрца адлягло: утульны пакой, сучасная мэбля, адным словам, усе ўмовы — толькі вучыся.

Уладзіслаў Апановіч уваходзіць у студсавет інтэрната № 3, у якім пражывае чацвёрты год. Хлопец вучыцца на архітэктурна-будаўнічым факультэце, займаецца грамадскай работай на факультэце, спявае ў знакамітым народным універсітэцкім хоры «Белая вежа». Гэтым летам Уладзіслаў працаваў у будатрадзе, засяляўся ў інтэрнат адным з апошніх, сказаў, што гэта адбылося хутка, без праблем. Яны з таварышамі жывуць разам ужо чацвёрты год: «Прыцерліся адзін да аднаго, арганізавалі побыт, словам, усё нармальна». Яшчэ Уладзіслаў згадаў пра строгую прапускную сістэму, асабліва ў пачатку навучальнага года, вахцёры скрупулёзна правяраюць прапускі, што апраўдана меркаваннямі бяспекі. Ёсць правілы для наведвання гасцямі, якіх студэнты павінны прытрымлівацца. Іншая справа, калі прыязджаюць бацькі, тады іх прапускаюць без праблем. «Словам, інтэрнат на час вучобы становіцца нашым другім домам», — падсумаваў студэнт.

Таццяна Стралкова, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта:

— Наша ўстанова адукацыі мае чатыры інтэрнаты. Цяпер мы на 100 працэнтаў забяспечваем месцамі іншагародніх студэнтаў. Прафкам займаецца пастаноўкай на ўлік тых студэнтаў, якія маюць патрэбу ў інтэрнаце, і размяркоўвае іх, а ўжо рассяленне па пакоях праводзіцца кіраўніцтвам кожнага інтэрната.

Прафсаюзная арганізацыя спрыяе цікаваму і змястоўнаму правядзенню вольнага часу студэнтаў: фінансуем цікавыя конкурсы, віктарыны, святочныя мерапрыемствы. І нагогул лічу, што пражыванне ў інтэрнаце для маладога чалавека азначае атрыманне пэўнага жыццёвага вопыту, побытавых навыкаў, якія абавязкова спатрэбяцца ў жыцці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва герояў.

Па сутнасці

Шлях да святыняў

У нас не прыжылася сквапная філасофія капіталістычнага дзікунства, не падтрымалі беларусы і ліберальныя рэформы. Мы на генетычным узроўні адрынулі іх. Духоўнасць — гэта якраз пра беларусаў. І яна не толькі ў рэлігійнасці, яна і ў кожным гуку беларускага слова, а яе носьбітам павінна быць адукацыя. Таму па ўжо звыклай традыцыі ў календары дзяржаўных свят побач з Днём ведаў і Дзень беларускага пісьменства.

Настаўнік — апора дзяржаўнасці. А галіна адукацыі — адна з асноўных. Гэта сфера адкладзеных дывідэндаў. Якасная адукацыя — моцная дзяржава. Педагог выхоўвае будучыню. Увогуле, настаўнік для беларускай нацыянальнай ідэі — асноўны персанаж. Гэта і пераемнасць пакаленняў, і ключ да ведаў, яркая прыкмета геннага імкнення да ведаў, а не да вайны. Беларусы заваёўваюць краіны і кантыненты, рынкі і аўдыторыі выключна сілай сваіх ведаў і кампетэнцый. Няважна, гэта самы вялікі кар'ерны самазвал у свеце ці выдатная пастаноўка Вялікага тэатра Беларусі. Нацыі талентаў патрэбен Настаўнік. І ён заўсёды — у цэнтры ўвагі. І наш Прэзідэнт па адным з дыпломаў — настаўнік, і прэзідэнцтва — гэта таксама настаўніцтва.

У аўтараў глабальнай трансфармацыі чалавецтва адна з асноўных мэт — знішчыць аўтарытэт настаўніцтва: бацькоў, педагогаў, улады і ў выніку — аўтарытэт краіны. Выйсце адно — размаўляць з моладдзю, знаходзіць зразумелыя словы і ўзаемаразуменне. Школа павінна стаць Храмам, дзе дзеці знойдуць арыенціры, а галоўнае — не страцяць сябе. Не для нас застрашаць мілітарызаванай мускулатурай, не пабеларуску гуляць каціроўкамі сусветных бірж, абвальваючы фінансавыя сістэмы. Мы бліжэй да зямлі, да працы, да Радзімы.

Цяпер якраз веды і сам працэс адукацыі з'яўляюцца залогам таго, што мы і застанёмся гаспадарамі на нашай зямлі. Гэта класіка літаратуры і сучаснай геапалітыкі. «На ростанях» цяпер стаіць не Лабановіч, на скрыжаванні — уся Беларусь. Перад вырашэннем стратэгічнай задачы — не аддаць моладзь заходняму свету. Прычым апошняе датычыцца ўсяго грамадства, а не толькі адукацыі. Тады на геапалітычных і светапоглядных «ростанях» не страцім свой правільны беларускі шлях. А гэта і ёсць наш шлях да сапраўдных святыняў.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У краінах СНД зафіксавалі амаль 200 спроб тэрактаў



Летась у краінах СНД папярэджана большасць тэрарыстычных злачынстваў, заявіў кіраўнік Антытэрарыстычнага цэнтра (АТЦ) Садружнасці Яўген Сысоеў на сумеснай канферэнцыі СНД і ШАС па пытаннях супрацьдзеяння тэрарызму і экстрэмізму ў Ташкенце. Аб гэтым паведаміла ТАСС. «Здзейснены спробы да ўчынення больш як 300 злачынстваў тэрарыстычнай накіраванасці, у тым ліку 195 тэрарыстычных актаў. Да крымінальнай адказнасці прыцягнута звыш 2100 злачынцаў», — сказаў Яўген Сысоеў. Паводле яго слоў, пераважная большасць гэтых спроб была спынена на стадыі падрыхтоўкі, што дало магчымасць прадухіліць шматлікія аховары і звесці да мінімуму матэрыяльную шкоду. Разам з тым, адзначыў кіраўнік АТЦ СНД, «міжнародныя тэрарыстычныя арганізацыі праяўляюць жывучасць», і тэрарызм застаецца адной з найбольш небяспечных праблем нашага грамадства. «Дзяржаў, не закранутых тэрарыстычнымі атакамі, у свеце практычна не засталося», — канстатаваў Яўген Сысоеў.

Сусветныя цэнтрабанкі закупілі 37 тон золата

Сусветныя цэнтрабанкі ў ліпені, паводле папярэдніх ацэнак World Gold Council (WGC), павялічылі аб'ёмы золата ў сваіх золатавалютных рэзервах. Найбуйнейшымі пакупнікамі былі Польшча (14,3 тоны), Узбекістан (9,6 тоны) і Індыя (5,4 тоны). Таксама павялічылі запасы Іарданія (4,3 тоны), Турцыя (3,8 тоны), Катар (2,3 тоны), Чэхія (1,6 тоны), Егіпет і Мальта (па 0,1 тоны). Прадавалі золата Казахстан (3,9 тоны) і Манголія (0,7 тоны). «Цэнтральныя банкі захоўваюць прыхільнасць назапашванню золата ў апошнія месяцы. Хоць агульны ўзровень попыту падаецца, паколькі кошт золата працягваў расці да новых максімумаў, ён, тым не менш, заставаўся станоўчым», — адзначае ў аглядзе аналітык WGC Крышан Гопал.

Новая Зеландыя значна павялічыць уязную плату для турыстаў

З 1 кастрычніка адпаведныя плацяжы ўзрастуць амаль утрая. Пра гэта паведаміла Reuters са спасылкай на заяву ўрада Новай Зеландыі. Зборы для замежных наведвальнікаў, а таксама зборы за ахову прыроды і турызм плануюць павялічыць з 35 да 100 новазеландскіх долараў (з $21 да $62), каб «гарантаваць наведвальнікам магчымасць уносіць уклад у грамадскія паслугі і атрымліваць высакаякасныя ўражанні падчас наведвання Новай Зеландыі». Гэтае рашэнне выклікала крытыку з боку прадстаўнікоў турыстычнага сектара, якія сцвярджаюць, што больш высокі збор адпудзіць турыстаў. Як і многія папулярныя турыстычныя месцы ў свеце, Новая Зеландыя змагалася з уздзеяннем турыстаў на навакольнае асяроддзе, паколькі інфраструктура была перагружана вялікай колькасцю наведвальнікаў. Збор у памеры 35 новазеландскіх долараў быў уведзены ў ліпені 2019 года, але гэтага аказалася недастаткова, каб пакрыць выдаткі, звязаныя з такой колькасцю наведвальнікаў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

Чаму людзям своечасова не даюць зарплату?

Разабраліся на дэпутацкім узроўні

Слухаць людзей і своечасова прымаць рашэнні на месцах — важныя задачы для дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў. Народныя выбраннікі на пастаяннай аснове праводзяць дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, прыёмы і асабістыя сустрэчы з грамадзянамі, выбаршчыкамі, удзельнічаюць у розных пасяджэннях. Гэта стала неад'емнай часткай іх работы. Акрамя дзелавых і афіцыйных сустрэч, яны нярэдка бяруць удзел у рэспубліканскіх суботніках і іншых акцыях, накіраваных на добраўпарадкаванне тэрыторыі. Больш падрабязна аб актыўнай дэпутацкай дзейнасці і пра тое, што робіцца для сваёй 96-й акругі, карэспандэнту «Звязды» распавёў член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ.

— Сяргей Міхайлавіч, годныя ўмовы працы і ўзровень заработнай платы з'яўляюцца асабліва важнымі для кожнага працоўнага. Даведаліся, што на адным з прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі вашай акругі, ёсць пэўныя праблемы з выплатамі. Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна аб сітуацыі, якая склалася, і што робіцца для вырашэння гэтых праблем.

— У маёй акрузе ёсць два такія прадпрыемствы: адно прыватнай формы ўласнасці, другое — дзяржаўнай. На адным з прадпрыемстваў, якое спецыялізуецца на перапрацоўцы і продажы рыбы, людзі скардзіліся на затрымкі заработнай платы. На жаль, у дадзенай сітуацыі грамадзяне не звярнуліся наўпрост па дапамогу да органаў улады, а вырашылі запісаць відэа ў вядомай сацыяльнай сетцы. Тады мы сустрэліся з працоўным калектывам, прапанавалі работнікам, якіх не задавальняе заработная плата і ўмовы працы, дапамогу ў працаўладкаванні і пошуку іншага месца работы. Сёння ў Мінску хапае вакансій, і мы гатовыя аказаць садзейнічанне кожнаму. У нашых сілах зрабіць так, каб людзі атрымалі стабільную працу са стабільнай заработнай платай.

Як высветлілася, значную частку людзей задавальняе работа на прыватным прадпрыемстве. Адзінае — яны просяць падстрахаваць, каб не было збояў з выплатамі. З кіраўніцтвам прадпрыемства вызначылі, што цяпер пытанне выплат заробкаў — на кантролі дэпутацкага корпуса. Калі будуць узнікаць нейкія пытанні, будзем падключацца для таго, каб іх вырашыць у рамках прававога поля. Акрамя таго, мы наладзілі прамы кантакт з работнікамі. Цяпер кожны супрацоўнік мае нумар майго мабільнага тэлефона. У выпадку ўзнікнення якіх-небудзь пытанняў у людзей ёсць прамы кантакт з прадстаўніком органа ўлады, які ўмяшаецца, каб вырашыць пытанне і дапамагчы людзям.

Заработная плата і яе ўзровень — адно з першачарговых пытанняў, якія ў нас на кантролі. Цяпер праблемнае прадпрыемства ў зоне асаблівай увагі ў мяне як дэпутата акругі, на тэрыторыі якой яно знаходзіцца. Прадпрыемства невялікае, у ім працуе каля 30 чалавек. Але нам важныя лёсы і жыцці кожнага, а таксама і ўмовы працы. Цяпер гэтыя людзі пад нашай апекай.

Праблема была пазначана ў сацыяльных сетках. Натуральна, мы павінны былі адрэагаваць. Гэта яшчэ адзін знак таго, што сёння мы павінны больш актыўна працаваць у акругах, суправаджаць нашу работу інфармацыйна, каб людзі ведалі, куды ў выпадку чаго можна звярнуцца. У Беларусі, у адрозненне ад многіх іншых краін, дэпутаты і іншыя чыноўнікі ў першую чаргу нацэлены на вырашэнне праблем чалавека. У шэрагу краін мы не ўбачым дэпутата на заводзе і ў студэнцкіх калектывах. Наша задача — дайсці да кожнага. Мы наведалі і іншыя прадпрыемствы, каб абмяняцца кантактамі з кіраўніцтвам і працоўнымі калектывамі, каб прадухіліць падобныя сітуацыі. Самае галоўнае — зрабіць так, каб людзі былі задаволены ўмовамі працы. І яшчэ раз паўтару, што ў сталіцы сёння хапае вакансій, і я, як дэпутат і член камісіі па садзейнічанні занятасці Кастрычніцкага раёна, гатовы падключацца і вырашаць пытанні, у тым ліку звязаныя з выкананнем працоўнага заканадаўства.

— Неад'емнай часткай работы дэпутатаў усіх узроўняў з'яўляецца правядзенне прамых тэлефонных ліній і асабістых прыёмаў грамадзян. Такія мерапрыемствы дазваляюць паглыбіцца ў праблемы людзей, часта — разгледзець тыя ці іншыя моманты заканадаўства. Якія праблемы хвалююць жыхароў вашай акругі?

— У мяне ўсталявалася такая форма зносін з выбаршчыкамі, як анлайн-прыёмы. Мой мабільны тэлефон вядомы ў акрузе, ён неаднаразова размяшчаўся ў грамадскіх месцах для таго, каб жыхары маглі ўбачыць, куды можна патэлефанаваць ці напісаць. Гэта досыць эфектыўная форма ўзаемадзеяння з людзьмі, якая дазваляе ў любы час, у любую хвіліну звязацца і вырашыць пытанне.

Я прыхільнік таго, каб праблемы маіх выбаршчыкаў вырашаліся больш аператыўна, у тым ліку і па тэлефонным званку. Калі мне паступае той ці іншы зварот, я адразу ж магу звязацца з кіраўніком арганізацыі, прадпрыемства і ўдакладніць, чаму пытанне не вырашаецца, як яго вырашыць і як дапамагчы грамадзяніну ў рамках прававога поля. Гэта значна паскарае працэс, аднак, вядома, бываюць і зацяжныя пытанні, дзе патрабуецца прыняцце лакальных нарматыўна-прававых актаў.

На шчасце, большасць пытанняў вырашаецца ў анлайн-рэжыме, што дазваляе аператыўна іх здымаць. Акрамя таго, прыемна, што сёння паступае шмат званкоў з падтрымкай палітыкі і курсу, тых ці іншых рашэнняў, а таксама падзяк нашаму Прэзідэнту. Людзі просяць перадаць кіраўніцтву краіны словы падзякі за дапамогу ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў.

У цэлым, жыхароў маёй акругі хвалююць самыя розныя праблемы: пачынаючы ад пад'ездаў, лавачак, рамонту дарог, заканчваючы прапановамі па карэкціроўцы законаў. Трэба разумець, што ў Беларусі дэпутат любога ўзроўню — гэты той чалавек, які вырашае пытанні людзей. Палітычныя пытанні хвалююць выбаршчыкаў другасна. У першую чаргу жыхароў хвалюе тое, з чым яны сутыкаюцца кожны дзень. Тым не менш мы павінны развіваць палітычную культуру.

Такім чынам, работа з грамадзянамі — важны кірунак дзейнасці. Але мы павінны разумець, што асноўная задача — заканатворчая дзейнасць. Стала добрай практыкай тое, што дэпутат сам ідзе да людзей з просьбай звярнуць увагу на той ці іншы закон, прыходзіць па прапановы і магчымыя карэкціроўкі. Гэта беларускае ноу-хау, такога практычна нідзе няма. Гэта наш фармат народнай дэмакратыі, народнай улады краіны. Вядома, для нас, дэпутатаў, такія мерапрыемствы таксама вельмі карысныя. Унікаючы ў пытанні людзей, фарміруем меркаванне, якое затым адлюстроўваем у карэкціроўцы нашага заканадаўства.

— У Беларусі стартуе акцыя «Беларусь адзіная». Сімвалічна, што 17 верасня — Дзень народнага адзінства — выпадае якраз на другую сесію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. На вашу думку, для чаго праводзяцца такія акцыі і якая роля дэпутата ў іх?

— Акцыя «Беларусь адзіная» — гэта адна з традыцыйных форм святкавання Дня народнага адзінства — свята ў сучаснай гісторыі новага, але гістарычна зусім не новага. Мы памятаем, што такое свята было ўстаноўлена ў пэўныя перыяды савецкай улады. Сёння яно, вядома, зайграла новымі фарбамі на фоне таго, што адбываецца вакол, а таксама на фоне ўмацавання нашай дзяржаўнасці. Гэта асабліва важна, каб мы маглі жыць так, як самі таго хочам, а не так, як хочуць нейкія палітыкі за межамі нашай краіны.

Вядома, не ўсе грамадзяне маюць гістарычную адукацыю, не ўсе цікавяцца грамадска-палітычным жыццём. Гэта таксама нармальна, гэта натуральны працэс для ўсяго свету. З дапамогай гэтай акцыі мы зможам даносіць асновы гістарычнай палітыкі ў кантэксце народнага адзінства, што важна для кожнага чалавека. Кім бы ты ні быў: урачом ці сталяром, прафесарам ці міліцыянерам — грамадска-палітычны кампанент важны для кожнага жыхара краіны для таго, каб чалавек арыентаваўся ў прасторы і не страціў сваю краіну, як гэта здарылася ва Украіне, дзе большая частка людзей не цікавілася і не ўдзельнічала ў грамадска-палітычным жыцці. Сёння, на жаль, за палітычныя памылкі невялікай групы людзей расплачваецца ўсё грамадства. Цікавіліся яны палітыкай ці не, але гэта цяпер датычыцца ўсіх. Прычым самым крывавым чынам.

Нам важна не дапусціць падобных памылак, каб наша краіна, наша грамадства разумела, што адбываецца ўнутры краіны і за яе межамі, і ў адзінстве адстойвала інтарэсы краіны, а значыць, і свае асабістыя інтарэсы. На жаль, ёсць ворагі, якія не хочуць, каб у нас было адзінства. Без адзінства лёгка кіраваць працэсамі і выкарыстоўваць нас. А як нас хочуць выкарыстоўваць — мы выдатна ведаем. Як і Украіну. Мы ўсяго толькі таран у вачах амерыканскіх палітыкаў, у іх барацьбе з Расіяй. А хто хоча сёння быць таранам і пакласці свае жыцці за інтарэсы амерыканскіх алігархаў? Ніхто. Акцыя «Беларусь адзіная» якраз-такі нацэлена на тое, каб растлумачваць гэтыя важныя асновы. Наша задача — даць інфармацыю і веды. На гэта і нацэлена акцыя, якая стала традыцыйнай напярэдадні Дня народнага адзінства, неад'емнай часткай гэтага вялікага свята. І сёння прадстаўнікі дэпутацкага корпуса прымаюць актыўны ўдзел у яе правядзенні.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,
Фота з архіва Сяргея КЛІШЭВІЧА.

Падтрымка маладзёжных ініцыятыў

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Віцебскай-Кастрычніцкай выбарчай акрузе № 20 Юрый ПАНФІЛАЎ працуе толькі першы дэпутацкі тэрмін, аднак з тым, чым жыве паўночная сталіца, знаёмы не па чутках — за плячыма Юрыя Анатольевіча 13 гадоў на пасадзе кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага і Чыгуначнага раёнаў Віцебска.

«У маёй акрузе размяшчаюцца ўсе галоўныя адміністрацыйныя будынкі, праходзяць ключавыя культурныя мерапрыемствы горада на Дзвіне. Вялікая прамысловая зона — СЭЗ, два флагманы — фабрыкі абутку і іншыя прадпрыемствы фарміруюць больш за 60 % ва ўдзельнай вазе эканомікі горада. Кастрычніцкі раён заўсёды быў добраўпарадкаваным і дагледжаным, такім застаецца і сёння. Вядома, што камунальныя пытанні ўзнікаюць усюды, але яны хутка вырашаюцца», — расказвае дэпутат.

Гаворачы аб сваіх выбаршчыках, Юрый Анатольевіч адзначае, што гэта людзі, з якімі яму даводзілася мець зносіны і раней, таму аўтарытэт, напрацаваны за доўгія гады ў адміністрацыі, не змяншаецца, а толькі ўзмацняецца. Для кожнага чалавека Панфілаў знаходзіць свой падыход і заўсёды адкрыты да новых ідэй. «Тры гады таму да мяне звярнуліся студэнты (а вышэйшых навучальных устаноў у Віцебску — пяць) з просьбай арганізаваць для іх прастору, дзе можна будзе сустракацца, праводзіць мерапрыемствы і проста адпачываць. Ідэя мне спадабалася, правялі невялікі конкурс праектаў, з пяці сабралі адзін і ўвасобілі ў студэнцкі сквер, які размяшчаецца насупраць Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Там ёсць унікальны для горада аб'ект — крыты вулічны кінатэатр на 40 месцаў, лаўкі, дзе можна схавацца ад непагадзі, і сталы для настольных гульняў, вялікі дзіцячы гульнявы комплекс, сучасная ілюмінацыя. Урачыстае адкрыццё адбылося 2 верасня, мы ўжо атрымалі ад моладзі мноства пазітыўных водгукаў і падзяк», — гаворыць Юрый Панфілаў.

Гэты аб'ект — не адзіная добрая справа, да якой парламентарый не толькі непасрэдна прыклаў руку, але і вёў ад пачатку да канца. Так, у пойме ракі Віцьба добраўпарадкавалі зону адпачынку для дарослых і дзяцей, якая цяпер сярод гараджан лічыцца востравам здароўя. Для малых стварылі асобны паўвостраў «Вясёлкавы свет», дзе размяшчаецца цэлы гульнявы комплекс, а дзеці не перасякаюцца з веласіпедыстамі і спартсменамі. Аматары водных прагулак могуць скарыстацца катамаранамі. Важна і тое, што ў палатках стрыт-фуду катэгарычна не прадаюць спіртныя напоі. Шмат чаго дэпутат разам з выбаршчыкамі зрабілі для добраўпарадкавання зоны: на суботніках высаджвалі вербы і хвойныя дрэвы, устанаўлівалі столікі і лаўкі, дамаўляліся наконт аракцыёнаў. Раней у пойме Віцьбы нават праходзілі танцавальныя вечары, дзе ўсе ахвотныя разам з прафесіяналамі маглі далучыцца да танга і сальсы, у будучыні, магчыма, гэты праект ізноў вернецца на востраў здароўя.

Раз на месяц дэпутат праводзіць асабісты прыём грамадзян, на якім ніколі не бывае пуста. «Людзі звяртаюцца з надзённымі праблемамі: кагосьці турбуе шум кандыцыянераў з крамы на першым паверсе жылога дома, кагосьці цікавяць пытанні аховы здароўя. Нядаўна з калектыўным зваротам прыйшлі людзі наконт капітальнага рамонту дома. Мы разабраліся ў сітуацыі, паставілі дом у план на бягучы год, а пакуль камунальным службам было дадзена даручэнне падтрымліваць праблемныя камунікацыі ў прыдатным для жыцця стане. З кожным пытаннем, з якім звяртаюцца выбаршчыкі, працуем скрупулёзна, калі ёсць магчымасць — вырашаем адразу на месцы пры падтрымцы мясцовай улады. Часта на прыём прыходзяць з падзякамі за вырашаныя праблемы, а тэндэнцыя зніжэння зваротаў грамадзян гаворыць аб тым, што дэпутацкі корпус і органы мясцовага самакіравання працуюць эфектыўна, што не можа не радаваць», — расказвае Юрый Панфілаў.

На сустрэчах у працоўных калектывах парламентарый лічыць галоўным расказваць людзям аб новаўвядзеннях у заканадаўстве, аб тым, што робіцца ў нашай краіне. «Заўсёды цікаўлюся ў выбаршчыкаў, ці згодныя яны з тым ці іншым законам, што трэба змяніць, на што звярнуць увагу. Гэта і з'яўляецца адным з інструментаў кансалідацыі нашага грамадства», — заключыў Юрый Анатольевіч.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва дэпутата.

Сямейная газета
Выпуск № 15 (240)

Як ёсць

Супраць ветру

Ён у бацькоў быў адным-адзіным сынком, яна — адзінай дачушкай. Розніца толькі ў тым, што яго «продкі» былі жывымі-здаровымі, разам, а вось яе...

На жаль, не: маці ў 28 гадоў цяжка захварэла (рассеяны склероз), бацька, як толькі дазнаўся, што хвароба гэта ўсур'ёз і надоўга, з'ехаў у заробкі і знік.

Аднак дачка на ўсё гэта неяк мала зважала: расла вельмі спрытнай, дужай, вясёлай. Гадоў з сямі-васьмі магла самастойна схадзіць у краму, прыбраць у кватэры, зварыць нешта з'есці — даглядала сябе і матулю, як ні дзіўна, паспяваючы пры гэтым добра вучыцца, маляваць, спяваць у ансамблі, шыць (дакладней — перашываць з нечага старога) новыя спаднічкі... А ў старэйшых класах нават закахацца ў суседа па парце, таго самага адзінага сынка. І адчуць, што гэта — узаемна!

Каханне, як кашаль — яго не схаваеш. А тым больш ад бацькоў. Яе, Нініна, маці, зразумеўшы, заўважыўшы, здаецца, дзень і ноч святкавала б, плакала ад радасці, што дажыла... Яго, Лёнева, якраз наадварот: шалела ад злосці, бо лічыла, што сын яе — прыгожы, любімы, адзіны — ну, вядома ж, варты лепшага і стакроць лепшай! Маці хацелася, каб абранніца была...

Ну, па-першае, ні ў якім разе не цяпер, не ў яго 18.

Па-другое — з нейкай іншай сям'і, не з такой — з людскай, гэта значыць, поўнай, інтэлігентнай, прыстойнай, пажадана — больш-менш забяспечанай, а найлепш багатай. Бо маладым жа прыйдзецца дапамагаць — атрымліваць адукацыю, будаваць кватэру, абжывацца ў ёй, гадаваць унукаў. А тут (сорам каму сказаць) — у дзяўчыны «ні кап'я» за душой, бацька — невядома хто і невядома дзе, маці — калека, не сёння-заўтра, крый бог, памрэ...

Яна, дарэчы, цудоўна разумеючы гэта, назапасіла неяк сіл і ўпотай ад дачкі ўсё ж дабралася да канторы, дзе працаваў Лёнеў бацька, папрасіла людзей, каб паклікалі яго, пасадзіла на лаўку побач са сваёй інваліднай каляскай і стала казаць, што яго сын і яе дачка сябруюць, што пачуцці ў іх (яна ведае, бачыць!) — самыя чыстыя, што яны збіраюцца разам паступаць, разам вучыцца далей, што пра вяселле размова пакуль не ідзе... А калі і так, калі некалі і пойдзе, то ім, Лёневым бацькам, не трэба ні баяцца, ні хвалявацца, бо дачка яе, зразумела ж, — гаротніца, але пры гэтым вялікая працаўнічка, самая разумная і добрая ў свеце, што з яе атрымаецца найлепшая жонка і гаспадыня, што іх сын — да бабкі не хадзі! — будзе шчаслівым... І бацькі пры ім, адпаведна, таксама.

Стала даводзіць яшчэ, што дзеці зусім маладыя, што кахаюць першы раз у жыцці і што нельга — грэх — ім чыніць перашкоды, а тым больш разлучаць...

Бацька маналог гэты слухаў, курыў, спачатку і з усім як быццам згаджаўся, нават падтакваў. Але ж потым, на развітанне, сказаў быццам адрэзаў: «Мая — супраць. Катэгарычна... А я?.. Што я? Вы ж, бачу, разумная жанчына, вы ж ведаеце: з жонкай спрачацца, што супраць ветру... Так што няхай яна робіць, што хоча. Я ў гэта ўмешвацца не буду».

...З той маўклівай бацькавай згоды Лёнева маці падмітусілася — знайшла нейкую далёкую, але ўплывовую радню ў Піцеры, з поўным кашальком і клункамі з'ездзіла туды, каго трэба задобрыла: яе хлопца для пачатку прынялі вучыцца, узялі на кватэру, потым сталі знаёміць з дзяўчатамі — з адной, з другой... І ў выніку дамагліся — разлучылі са школьнай сяброўкай, ажанілі з іншай, з такой, «як трэба»: з бацькамі, кватэрай, машынай, дачай... Праўда, сыну ўсё гэта неяк «не зайшло», не прыдалося: года не пажыў — развёўся.

І з вучобай нічога не атрымалася — кінуў.

Пасля гэтага хацеў вярнуцца дамоў — такім, як ёсць. Маці не дазволіла — соромна.

Прыйшлося паматацца па свеце, ажаніцца яшчэ. І зноў няўдала.

...Зрэшты, размова тут зусім не пра яго. І нават не пра маці, што так і не ўбачыла свайго адзінага пераможцам, на белым кані (памерла ў няпоўныя шэсцьдзясят ад анкалогіі).

Бацька цяпер дажывае адзін — нямоглы, амаль сляпы — як кажа, «малітвамі маёй Аляксееўны»!

Аляксееўна — гэта яго доктарка, гэта Ніна-Ніначка, тая самая дзяўчына, якую так моцна кахаў яго сын, якога ўсім сэрцам кахала яна. І якіх ён, бацька (так-так — іншых вінаватых няма!) разлучыў, пабаяўшыся — хоць аднойчы — пайсці... супраць ветру.

Валянціна ДОЎНАР.

Тыя, хто побач

Жыццёвае крэда Сяргея Савіцкага

Першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама — пра сям'ю, любоў да Радзімы і бацькоўскія ўрокі



Цікавая акалічнасць: сямейны і працоўны стаж Сяргея Савіцкага супадаюць — і той, і той складае 21 год. Ён бацька трох цудоўных дачок, узорны сем'янін, руплівы гаспадар. Пра такіх жанчыны кажуць «як за каменнай сцяной». Калегі цэняць яго за моцны ўнутраны стрыжань і адказнасць. Усе гады сваёй працоўнай дзейнасці ён на кіруючых пасадах. Упартасць і непахіснасць перад цяжкасцямі дапамагаюць яму пераадольваць самыя складаныя перашкоды. А адкрыты характар і прыроднае абаянне даюць магчымасць хутка знаходзіць агульную мову з людзьмі. Як гэта — быць адначасова ўзорным бацькам, клапатлівым мужам, сумленным работнікам і прыстойным грамадзянінам — у нашай размове з Сяргеем САВІЦКІМ.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Адносіны

ДВОЕ — ГЭТА ЗАНАДТА?

Чаму распадаюцца шлюбы

Ні адна закаханая нявеста, прамаўляючы запаветнае «Так!», не думае аб разводзе і падзеле маёмасці праз суд. Ніводны закаханы мужчына, купляючы для мілай заручальны пярсцёнак, не можа сабе ўявіць, што калі-небудзь звернецца да яе з прапановай: «Нам лепш растацца». Шлюбы заключаюцца на нябёсах — гэта выказванне ведаюць усе. І, тым не менш, у нашай краіне разводам заканчваецца каля паловы love stories, што пачаліся словамі «Аб'яўляю вас мужам і жонкай»...

З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ СТАТЫСТЫКІ

У 2023 годзе прадстаўнікі ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны паведамілі, што за апошнія 10 гадоў колькасць разводаў у Беларусі скарацілася на 11 %. Так, у 2021 годзе было зарэгістравана 34,4 тыс. разводаў, што на 11 % менш, чым у 2011 годзе, і на 2 % менш, чым у 2020-м. Але, зрэшты, і саміх зарэгістраваных шлюбаў стала менш, адзначылі прадстаўнікі Мінпрацы: за 10 гадоў іх колькасць зменшылася на 31 %. Спецыялісты звязваюць гэта найперш са скарачэннем колькасці насельніцтва ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў. Пры гэтым, калі параўноўваць 2021 год з 2020-м, колькасць шлюбаў павялічылася на 18 %, і гэта самы значны прырост за апошняе дзесяцігоддзе, адзначылі ва ўпраўленні народанасельніцтва. Прычынай таму, верагодна, стала рэалізацыя адкладзеных з-за пандэміі вяселляў.

А ў цэлым, расказалі прадстаўнікі Міністэрства працы і сацабароны, сёння моладзь падыходзіць да пытанняў шлюбу, сям'і і нараджэння дзяцей больш узважана і свядома. Уступаюць у шлюб сучасныя беларускі ў сярэднім у 26,5 года, мужчыны вырашаюць стварыць сям'ю ў 28,8 года. Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні першага дзіцяці — амаль 27 гадоў, у той час як у 1990 годзе ён не дасягаў 23 гадоў.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

ШУКАЮЦЬ БАЦЬКІ, ШУКАЕ МІЛІЦЫЯ...

Даведаліся, чаму падлеткі збягаюць з дому і як не дапусціць развіцця такога сюжэта

З падлеткамі складаней за ўсё: няшчаснае каханне, спрэчкі з сябрамі, непаразуменне з боку бацькоў, дрэнныя адзнакі і як вынік — уцёкі з дому... А ці ведалі вы, што ўтульныя сцены дома пакідаюць нават дзеці з уладкаваных сямей? Што прымушае непаўналетніх пайсці на такія сур'ёзныя крокі? Як не дапусціць падобных сітуацый? На гэтыя і іншыя пытанні пастараліся адказаць з начальнікам інспекцыі па справах непаўналетніх УУС адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы маёрам міліцыі Паўлам ГОМАНАМ.

— Павел Аляксандравіч, наколькі нам вядома, вы не адразу звязалі сваё жыццё з органамі ўнутраных спраў. З чаго пачаўся праваахоўны шлях?

— Па спецыяльнасці я педагог, пасля заканчэння ВНУ працаваў два гады ў школе, потым быў прызваны на тэрміновую службу. Міліцэйскі шлях пачаўся ў 2006 годзе, калі я стаў байцом Дэпартамента аховы МУС, міліцыянерам-вадзіцелем групы затрымання. У ходзе размоў з людзьмі, з падлеткамі, а таксама прыбыцця на розныя здарэнні часта сутыкаўся з рознымі момантамі, звязанымі з недабрабытам у сем'ях і дзіцячай безнагляднасцю. Падчас начных рэйдаў бачыў на вуліцах дзяцей, якія былі пакінуты на волю лёсу. Часцяком яны станавіліся пацярпелымі, у дачыненні да іх здзяйсняліся супрацьпраўныя дзеянні альбо ж самі падлеткі станавіліся ўдзельнікамі правапарушэнняў або злачынстваў.

«Часцяком непаўналетні застаецца сам-насам. Ён спрабуе сацыялізавацца, пабудаваць зносіны, рэалізаваць сябе, знайсці ўвагу па-за домам».

У той перыяд у мяне склалася выразнае жаданне працаваць у інспекцыі па справах непаўналетніх. Тым больш мая асноўная адукацыя дазваляла лепш разумець дзяцей, іх учынкі і паводзіны, знаходзіць патрэбныя словы ў складаных сітуацыях. Трапіўшы ў праваахоўныя органы, я моцна зацікавіўся гэтым шляхам. У 2012 годзе стаў участковым інспектарам інспекцыі па справах непаўналетніх. З таго моманту не збочваю з гэтага кірунку.

— Якія, на вашу думку, асноўныя прычыны ўцёкаў дзяцей з дому?

— Асноўная прычына сыходу непаўналетніх з дому — часцей за ўсё адсутнасць разумення ў сям'і, адсутнасць магчымасці зносін з бацькамі. Кожны дарослы чалавек імкнецца забяспечыць сваіх дзяцей усім магчымым, аддаючы пры гэтым больш увагі працы і іншым грамадскім узаемаадносінам. Часцяком непаўналетні застаецца сам-насам. Ён спрабуе сацыялізавацца, пабудаваць зносіны, рэалізаваць сябе, знайсці ўвагу па-за домам (такім чынам зносіны з сябрамі становяцца для яго больш прыярытэтнымі і блізкімі, чым з роднымі) або прыцягнуць цікавасць бацькоў сваімі ўчынкамі (на жаль, не заўсёды добрымі).

Другі момант — дзіця сутыкаецца з пэўнымі праблемамі і не можа знайсці правільнае рашэнне. Бацькі бачаць, што сын або дачка паводзіць сябе няправільна, і пачынаюць вучыць, як сябе паводзіць. Такім чынам узнікае сцяна непаразумення, з-за чаго дзіця збягае з дому.

І трэцяя прычына — гвалт у сям'і ў любой форме з боку родных і блізкіх. Гэта можа быць як фізічны і псіхалагічны, так і сексуальны гвалт, што спараджае спробу дзяцей выратавацца, у выніку чаго яны пакідаюць сцены дома.

На жаль, такіх сітуацый шмат. Прайшоўшы вялікі шлях у інспекцыі па справах непаўналетніх, сутыкаешся з абсалютна рознымі выпадкамі. Часцей за ўсё прасочваюцца агульныя прычыны сыходу. Але, разбіраючыся ў кожнай сітуацыі, разумееш, што ўсе выпадкі індывідуальныя.

— Якія запомніліся найбольш?

— Кожны ўнікальны. Але заўсёды павучальны. Размаўляючы з бацькамі, з дзецьмі, спрабуеш данесці, што самае важнае ў сям'і — паразуменне. Быў выпадак, калі хлопчык гадоў васьмі сам прыйшоў у грамадскі пункт аховы правапарадку (я тады быў яшчэ звычайным інспектарам ІСН) і заявіў: «Я сышоў з дому, забярыце мяне ў дзіцячы дом». Сталі разбірацца ў сітуацыі. Малады чалавек уцёк з-за таго, што бацькі сталі абмяжоўваць яго ў правах, у прыватнасці забаранілі гульні ў тэлефоне. Дарэчы, дзіця з уладкаванай сям'і, вучыцца ў добрай навучальнай установе. Бацькі спрабавалі выхоўваць яго абмежаваннямі, а ён не хацеў гэтага. Сітуацыя здаецца абсурднай, але нават яна можа спарадзіць сыход дзіцяці з дому. Строгія забароны ад бацькоў заўсёды былі важнай падставай для непаўналетняга раззлавацца. На жаль, не заўсёды бацькі спрабуюць зразумець, вырашыць праблему, прапанаваць кампрамісныя варыянты выхаду з сітуацыі.

Зыходзячы з аналізу здарэнняў з падлеткамі, можна прыйсці да высновы, што часцей за ўсё яны падвяргаюцца супрацьпраўным дзеянням з боку трэціх асоб у цёмны час сутак. Пасля 23.00 падлетак, які не дасягнуў 16-гадовага ўзросту, павінен знаходзіцца альбо ў суправаджэнні законных прадстаўнікоў, альбо дома. Адказнасць за дзяцей ляжыць на бацьках: за знаходжанне асобы, якая не дасягнула 16-гадовага ўзросту, ноччу без суправаджэння дарослых прадугледжана адміністрацыйная адказнасць па частцы 2 артыкула 10.3 КаАП РБ.

Інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Дзмітрый КЕДА праводзіць прафілактычнае мерапрыемства для падлеткаў.

«Пасля прагляду фільма «Легенда нумар 17» непаўналетні збег з дому, каб... займацца ў юнацкай секцыі. Уцекача знялі з цягніка пад Смаленскам».

Падлеткавае каханне таксама часта становіцца прычынай уцёкаў. У 2018 годзе зніклі двое падлеткаў: хлопчык 17 гадоў і дзяўчынка 14 гадоў. Апошняя раней ужо сыходзіла з дому, пра знікненне заяўлялі яе бацькі. Знаходзілі яе дома ў гэтага хлопца. Другі раз яна не стала ўжо хавацца ў яго, бо разумела, што яе адразу знойдуць. Мы шукалі гэтых падлеткаў праз сродкі масавай інфармацыі: мінакі заўважылі іх на вакзале ў Оршы, пазналі і патэлефанавалі ў міліцыю. Яны збіраліся з'ехаць у Смаленск, але не паспелі. Іх знайшлі і вярнулі бацькам. У гэтым выпадку дзеці ўцяклі з дому з-за таго, што бацькі былі супраць іх кахання.

Многія такія пары імкнуцца трапіць за мяжу — напрыклад, наведаць начны Санкт-Пецярбург з яго разводнымі мастамі, паглядзець белыя ночы, зладзіць так званае рамантычнае падарожжа. Яны ездзяць па гарадах аўтаспынам і на электрычках, таксама спрабуюць хавацца ў цягніках.

Начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх УУС адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы маёр міліцыі Павел ГОМАН.

Быў выпадак, калі падлетак пабег за сваёй марай — хацеў стаць спартсменам. Але бацькі не давалі дзіцяці займацца спортам. Пасля прагляду фільма «Легенда нумар 17» непаўналетні збег з дому, каб... займацца ў юнацкай секцыі. Уцекача знялі з цягніка пад Смаленскам і вярнулі бацькам. А хлопчык проста ўсё жыццё марыў стаць хакеістам, уразіўся пасля прагляду фільма і вырашыў такім чынам змяніць сваё жыццё.

Дарэчы, у кожнай такой сітуацыі разбіраюцца спецыялісты. Як правіла, з дзецьмі такой катэгорыі працуюць псіхолагі і выяўляюць рэальныя прычыны ўцёкаў, бо падлеткі не заўсёды кажуць праўду, асабліва, калі ёсць пэўныя праблемы ў сям'і.

Помніцца і такі выпадак: падлетак уцёк з прыстойнай і поўнай сям'і, ніхто не разумеў, у чым прычына, і непаўналетні таксама маўчаў. Псіхолаг у працэсе гутаркі даведаўся, што маці ўжывала ў дачыненні да непаўналетняга фізічны гвалт. Непаўналетні свядома не хацеў нам пра гэта распавядаць, паколькі разумеў, што і для маці, і для яго самога надыдуць пэўныя наступствы.

Шукалі аднойчы двух дзяўчынак. Знайшлі на даху дзявятага паверха. Непаўналетнія заслалі там матрац і спалі ў абдымку «абаранкам» — было ўжо холадна. А ўцяклі проста з-за дрэнных адзнак у школе. Баяліся, што бацькі пакараюць...

Гадоў шэсць таму мы шукалі па Мінску згубленае шасцігадовае дзіця. Хлопчык толькі пайшоў у першы клас і не арыентаваўся у сталіцы. Высветлілася, што ён любіў катацца на грамадскім транспарце. Пры праглядзе камер відэаназірання міліцыянеры заўважылі, што школьнік заходзіць у аўтобус. На канчатковым прыпынку яго сустрэлі супрацоўнікі органаў унутраных спраў і адвезлі дадому. У той дзень хлопец праехаў і на метро, і на аўтобусе, і на тралейбусе, хоць бацькі былі ўпэўнены, што без іх дапамогі не зможа скарыстацца грамадскім транспартам.

— Якія парады можаце даць бацькам, каб пазбегнуць падобных сітуацый?

— Гутарыце са сваімі дзецьмі, праводзьце з імі свой вольны час, станьце для іх сябрам, які падтрымае і зразумее! Заўсёды стаўце сябе на іх месца і не спяшайцеся пакараць, штосьці забараніць. Але часам не перашкодзіць быць дзесьці больш строгім і стрымаць сваё бацькоўскае слова. Трэба так рабіць з самага дзяцінства, каб дзіця разумела гэту тонкую грань, а таксама і тое, што бацькі ў любым выпадку зробяць толькі добрае. Калі такое разуменне будзе, то паняцці «сябар» і «бацька» стануць для яго блізкімі. Тады непаўналетні ў першую чаргу падзеліцца сваімі праблемамі з табой, раскажа пра свае трывогі і жаданні.

«На жаль, не заўсёды бацькі спрабуюць зразумець, вырашыць праблему, прапанаваць кампрамісныя варыянты выхаду з сітуацыі».

Яшчэ адна важная парада для бацькоў — прымайце сваіх дзяцей, слухайце іх, не лайцеся і не крытыкуйце з парога. Заўсёды ў сітуацыі трэба спакойна разбірацца, шукаць шляхі вырашэння.

Дарэчы, падлеткі сёння эмацыянальныя, запальчывыя, хочуць усё і адразу. У непаўналетніх зашкальвае пачуццё ўседазволенасці, максімалізму. Усе мы былі дзецьмі, спрабавалі сабе і іншым нешта даказаць. Таму мы, дарослыя, павінны іх разумець.

Не забывайце і аб інфармацыйнай гігіене. Сацыяльныя сеткі — біч XXI стагоддзя. Часцяком прычынай сыходу дзіцяці з хаты можа стаць інтэрнэт-знаёмства. У сацыяльных сетках непаўналетнія знаёмяцца, а затым едуць адзін да аднаго ў госці, нават не падазраючы, кім можа аказацца чалавек па той бок экрана. Мы пастаянна праводзім прафілактычныя гутаркі з дзецьмі і іх бацькамі. Інспектары па справах непаўналетніх праводзяць сустрэчы ва ўстановах адукацыі, на прававых віктарынах, кіналекторыях і пры дапамозе сучаснай тэхнікі даносяць да дзяцей тое, што ім неабходна ведаць пра бяспеку ў інтэрнэце.

Існуюць розныя разумныя гадзіннікі з GPS-трэкерам, пры дапамозе якіх можна адсачыць перамяшчэнне свайго дзіцяці. Для больш дарослых дзяцей рэкамендуем устанавіць праграму на тэлефон, якая таксама дазволіць даведацца аб іх знаходжанні. Гэта робіцца не для таго, каб прыбегчы ў любы момант і паглядзець, з кім падлетак пайшоў у кіно, а каб ведаць, што дзіця знаходзіцца ў межах свайго раёна, горада.

Калі дзеці збягаюць з дому, яны знаходзяцца ў небяспецы. А менавіта іх бяспека — наша агульная мэта і задача. Да яе падключаюцца абсалютна ўсе службы. Гэта — прыярытэт.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Жыццёвае крэда Сяргея Савіцкага

Вялікая сям'я — гэта цудоўна!

— Вас можна лічыць шчаслівым татам: тры дачкі — сапраўдны скарб. Раскажыце пра іх, якія ў іх характары, захапленні?

— Канешне, я шчаслівы. Старэйшай Вераніцы ў верасні споўніцца 20 гадоў, Аліне ў жніўні было 16, а вось Лізавета Сяргееўна (***усміхаецца***) у нас самы юны член сям'і: у студзені адзначым яе 5-гадовы юбілей. Чаму Лізавета Сяргееўна? Калі збіраемся ў госці да бабуль, папярэджваем, што з намі едзе Лізавета Сяргееўна. Бабулі яе так і называюць. Малой падабаецца. І нават калі нехта пытаецца ў яе імя, яна адказвае: Лізавета Сяргееўна. Усіх дачок люблю, яны для мяне сапраўднае шчасце, хоць спачатку з жонкай чакалі сына. Нават імя падабралі — Мікіта. А нарадзілася Вераніка. Хутка зразумеў, што гэта добра. Усе тры дачкі розныя па характары. Агульнае — яны сціплыя, паважаюць старэйшых. У Веранікі мой, інжынерны, склад розуму. Яна вучыцца ва ўніверсітэце на хіміка-тэхнолага. Сярэдняя дачка Аліна яшчэ школьніца. Яна больш творчая натура, скончыла мастацкую школу. Вельмі прыгожа малюе, удзельнічае ў пленэрах. Ну, а малодшая дачка — мая памочніца. Калі ёй было 1,5 года, убачыла, як я ламінат кладу і малаточкам па ім пастукваю. Знайшла гумавы дзіцячы малаточак і давай паўтараць.

— Вы строгі бацька? Можаце пакараць за штонебудзь?

— Я не злы — мне дастаткова строгага позірку. У дачок прысутнічае пачуццё павагі да мяне.

— А ёсць адчуванне, што вы жывяце ў кветніку? Вы і чатыры прыгажуні вакол.

— У некаторай ступені так. Мне не трэба гатаваць сабе есці, заўсёды нехта ёсць дома, хто накорміць. Ды і прас у рукі не трэба браць, каб прывесці ў парадак кашулю.

— Дзяўчаты заўсёды модніцы, любяць мяняць уборы. Песціце дачок? Або ў чымсьці прыходзіцца стрымліваць?

— У мяне не хапае часу доўга быць побач з дзецьмі, але не шкадую грошы ім на абноўкі. Яны мне потым іх заўсёды дэманструюць. Ім важна пачуць маё меркаванне. Часам удзельнічаю ў іх шопінгу, раю нешта. І яны прыслухваюцца.

— Колькі грошай у месяц трэба для такой сям'і, як ваша?

— Умоўна 4-5 тысяч рублёў. Гэта з улікам камунальных і іншых неабходных штомесячных плацяжоў. А вось для таго каб адкласці, патрэбна большая сума. На грошы жонкі ніколі не прэтэндаваў. І сваёй зарплатнай картачкай не забараняю ёй карыстацца. Старэйшай дачцэ, якая вучыцца ў Мінску, выдзяляю пэўную суму на тыдзень і на дарогу дадому і назад. Стыпендыяй яна распараджаецца сама. Сярэдняя дачка пакуль з намі, ёй таксама даю на цукеркі і марожанае. І нават малодшай нешта перападае. Жонка спрабуе заахвочваць дзяцей грашамі за дапамогу па гаспадарцы, я — не. Даю проста за тое, што яны ёсць.

Сяргей САВІЦКІ — з мамай, сёстрамі і братам.

— Наколькі моцная ваша сям'я? Ці ўзнікае часам жаданне адпачыць адно ад аднаго?

— Сям'я заўсёды побач са мной. Пераезд у Магілёў быў для нас дзявяты за даволі кароткі перыяд. Кожны раз, калі я пераязджаў, праз некалькі дзён, тыдзень, максімум месяц жонка і дочкі зноў былі са мной. І гэта пры тым, што жонцы трэба было мяняць работу, а дзецям — садок або школу. Аліна ў 9 класе паўгода вучылася ў Мінскай вобласці, паўгода — у Магілёве. Нават даросламу чалавеку цяжка бывае адаптавацца на новым месцы, а тут дзіця, ды яшчэ ў такім узросце. Але яны ўсе ў мяне загартаваныя.

Радзіма там, дзе твае бацькі

— Падзяліцеся рэцэптам, як выхаваць добрых дзяцей?

— Асаблівых рэцэптаў няма. Я іх заўсёды вучыў самастойнасці. Казаў, што трэба дабівацца чагосьці самім, а я заўсёды змагу дапамагчы. Тры гады таму старшая дачка перад тым як паступіць у ВНУ, паспела папрацаваць. І вельмі ганарылася, што купіла новы тэлефон за свае грошы. Сярэдняя, як толькі ёй 14 гадоў споўнілася, таксама пайшла працаваць. Я ім тлумачу, што грошы проста так не даюцца. І яны вучацца планаваць. Праўда, малодшай дазваляецца больш. Старэйшыя нават крыўдзяцца, я з імі быў больш строгі.

Раніцай, калі я іду на работу, дочкі яшчэ спяць, але вечарам чакаюць мяне да апошняга, каб разам павячэраць. Я прыходжу, а вячэра ўжо на стале. Застаецца толькі рукі памыць. Гэта той самы час, калі мы можам усе разам пасядзець за сталом, пагутарыць. І я вельмі цаню такія хвіліны.

«Бацькоў трэба чуць, нягледзячы на сваю катастрафічную занятасць. Бо час, калі яны сыходзяць, прыходзіць непрыкметна».



Любімыя дачушкі.

Вельмі важна, каб дзеці паважалі дарослых. Прывучаю дачок, каб словы «бабуля» і «дзядуля» асацыяваліся ў іх з паняццем «Радзіма». Я сам гэта востра адчуў, калі бацька пайшоў з жыцця. Пакуль ён быў жывы, я часам адкладваў сустрэчы на потым, спасылаўся на тое, што заняты... Калі таты не стала, востра адчуў, што ён і мама — гэта нешта святое, да іх павінны быць асаблівыя адносіны. Бацькоў трэба чуць, нягледзячы на сваю катастрафічную занятасць. Бо час, калі яны сыходзяць, прыходзіць непрыкметна. Захочацца прыехаць, а ўжо няма куды. Аднойчы, калі я з сям'ёй ехаў да бацькоў у Пінск, мне патэлефанаваў калега, спытаўся, што я раблю. І я адказаў, што еду на радзіму. Пасля сярэдняя дачка Аліна спытала, а дзе яе радзіма. Ёй тады было ўсяго 7-8 гадоў. Пытанне заспела мяне знянацку. Было цяжка нешта патлумачыць. Цяпер ведаю адназначна: дзе твае бацькі, там і твая радзіма.

— Як размяркоўваеце абавязкі па доме? Дапамагаеце, напрыклад, жонцы гатаваць або дываны пыласосіць?

— На мне ўся мужчынская работа, а ўмею я ўсё: прыкляпаць, машыну адрамантаваць, электрычнасць наладзіць. Будаваць, капаць, майстраваць — гэта маё. Я практычна сваімі рукамі пабудаваў дом. Прычым з нуля. Выбіраў, дзе і як размясціць яго на ўчастку, рабіў падмурак, аздабленне і шмат чаго іншага. За два тыдні з цесцем накрылі дах. Тынкаваў, плітку клаў — ніякіх праблем. Калі малодшая нарадзілася, я ёй драўляныя перасовачныя арэлі зрабіў. А яшчэ — маленькае крэселка ў выглядзе зайчыка. Зрабіў нам з жонкай драўляны ложак, толькі матрац на яго купілі. Люблю жыць у прыватным доме, там шмат месца для творчасці. Можна па ўчастку прайсціся, траву пакасіць, градку ўскапаць. Жонка побач кветкі саджае. А вось жыць у кватэры мне не падабаецца.

Усё пачынаецца з дзяцінства

— Раскажыце, калі ласка, пра сваё дзяцінства. Дзе нарадзіліся, кім былі вашы бацькі, чаму навучылі?

— Нарадзіўся ў вёсцы Хварасно Пінскага раёна ў шматдзетнай сям'і. У мяне старэйшыя брат і тры сястры. З братам розніца ва ўзросце 15 гадоў. А з самай малодшай сястрой — 10. Калі пайшоў у першы клас, усе астатнія ўжо скончылі школу. Уся ўвага з дзяцінства была прыкавана да мяне. Сёстры і брат, калі прыязджалі з горада, везлі мне невялічкія гасцінцы. Я іх вельмі чакаў. Час тады быў іншы, і такіх празмернасцяў, як цяпер, не існавала, тым больш у вёсцы, тым больш у шматдзетнай сям'і. Бацька працаваў на трактары, я імкнуўся ў яго вучыцца. Дапамагаў разбіраць трактар. У класе 4-5 я ўжо сам на трактары ездзіў, бацька давяраў не толькі збоку пасядзець. Калі працаваў на камбайне, даваў і мне паруліць. І гэта жаданне засталося з тых часоў. Штогод, працуючы на розных пасадах, імкнуся сесці за штурвал камбайна і намалаціць бункер збожжа. Сёлета, калі віншаваў першага тысячніка на Магілёўшчыне, таксама сеў за штурвал. Цёплыя ўспаміны з дзяцінства так і нахлынулі...

— Вы са школы марылі працаваць у сельскай гаспадарцы?

— Я не марыў, я рос у гэтым. Маці часта хварэла, і я заставаўся з татам. А ён браў мяне на работу. Я нават часам спаў у яго ў кабіне. У школе на занятках вучэбна-вытворчага камбіната атрымаў пасведчанне трактарыста-машыніста і марыў працаваць у калгасе трактарыстам. Але кіраўнік сельгаспрадпрыемства Іосіф Гузіч сказаў: скончыш школу — дадзім табе накіраванне ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Я толькі адмахнуўся. Але пасля школы маці сабрала мае рэчы і сказала: «Едзем паступаць у Горкі». Я не пярэчыў. Пяць гадоў адвучыўся і прыехаў дадому з дыпломам з адзнакай, на сваім аўто і з жонкай. 1 ліпеня атрымаў дыплом, 19 — мы распісаліся, а 25 — пайшоў працаваць.

— Першая дачка нарадзілася, калі вам было ўсяго 22 гады. Гэта па цяперашніх мерках зусім юны ўзрост. Не хацелася пажыць для сябе?

— Я сам з вялікай сям'і, і гэта цудоўна! Уяўляеце, калі мы ўсе збіраемся ў маці, як шматлюдна становіцца ў доме?! Пяцёра дзяцей, у кожнага свая пара, унукі, праўнукі — вялікая атрымліваецца кампанія. Я самы далёкі госць. Тры сястры ў вёсцы паблізу ад маці жывуць, брат — у Драгічыне. Яны чакаюць, калі я дату абвяшчу, і падцягваюцца. Заўсёды стараюся прыехаць на матулін дзень нараджэння — 3 верасня. Сёлета гэта будні дзень, прыеду 7 верасня, і мы разам адзначым свята.

Мы з жонкай не адкладвалі дзяцей на потым. Дзеці нам не перашкаджалі пажыць для сябе. Старэйшыя па начах не турбавалі, спалі да раніцы. Толькі малодшая крыху неспакойная была. Падмяняў жонку ноччу, уставаў, каб пакарміць малую з бутэлечкі або пакалыхаць.

Пра «гарачую патэльню»

— У вас вельмі адказная пасада. Ці атрымліваецца пабыць з сям'ёй на выхадныя, з'ездзіць куды-небудзь адпачыць?

— У выхадныя — калі як, а вось у адпачынак хаджу стабільна двойчы на год — у другой палове чэрвеня і лістапада. Я так адпачываў, калі быў старшынёй райвыканкама. Калі на гэтым месцы першы раз агучыў свае планы наконт адпачынку, некаторыя сумняваліся, маўляў, хто ж мяне адпусціць. Але памыліліся. Галоўнае — да адпачынку паспець зрабіць усе неабходныя справы.

— З самага пачатку вы працуеце на адказных пасадах. Вы прынцыповы кіраўнік?...

— Так. Заўсёды ёсць свой пункт гледжання, і калі ведаю, што маю рацыю, буду настойваць на сваім.

— Прэзідэнт, калі прызначаў вас на гэту пасаду, «падбадзёрыў»: уся адказнасць ляжа на вашы плечы...

— Так. І пра «гарачую патэльню» сказаў (***усміхаецца***). Я на той момант быў адным з самых «старых» старшынь райвыканкамаў, адпрацаваў пяць гадоў і некалькі месяцаў. І Прэзідэнт не разумеў, чаму я з-пад Мінска захацеў паехаць у Магілёў. Я быў знаёмы з Анатолем Ісачанкам, і ён паклікаў мяне ў сваю каманду. І я пагадзіўся. Лічу, што павінен быць рух — або па гарызанталі, або па вертыкалі. Калі кіраўнік працуе на адным месцы больш за пяць гадоў, жыццё становіцца манатонным. А тут была магчымасць сябе праявіць. Прынцып — як у спартсмена: нейкая планка ёсць, і ты яе бярэш. Працую на Магілёўшчыне другі год, але сказаць, што планку ўзяў, яшчэ не магу. Даводзіцца вырашаць шмат бягучых пытанняў, а хацелася б больш глядзець на перспектыву. Але я ўжо дастаткова камфортна сябе тут адчуваю...

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Сяргея САВІЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

У ПАЛОНЕ НЕПАТРЭБНЫХ РЭЧАЎ

Навучыцца жыць тут і цяпер, не адкладваючы... сукенку на потым

Многія з тых, хто вырас у савецкі час, памятаюць фразы бацькоў: «Гэта табе навыраст», «Гэта да свята», «Гэта пра запас». Цяпер няма дэфіцыту тавараў, але ў шафах і на антрэсолях у немалой колькасці людзей па-ранейшаму «на потым» вісіць адзенне, ляжыць посуд. Чаму мы ствараем такія запасы і ў наш бездэфіцытны час? Ці трэба пазбаўляцца ад іх?

Пра пакупкі... забылася

Пачну з сябе. У гэтым годзе ўпершыню пасля вялікага перапынку праінспектавала шафу. Дзесьці далёка на паліцы знайшла два дробныя камячкі: у адным фірменным пакеце была майка за 2 еўра, у другім — блузка за 9,99 еўра. Усё гэта прыехала з апошняй паездкі ў Вільнюс перад «каронай»... Спачатку рукі не даходзілі, а потым пра пакупкі з-за іх сціплага кошту проста забылася. Цяпер з майкі трошкі вырасла, дык буду насіць на лецішчы ў межах свайго ўчастка, а блузка добра падышла. З новых рэчаў знайшла камплект пасцельнай бялізны з «Ікеі» за 5 еўра і прасціну на гумцы, набытую на акцыі за смешныя грошы. Адна такая прасціна выкарыстоўваецца, а другая так і ляжыць упакаваная.

Прызнаюся, неяк утварыўся ў мяне пункцік: з кожнага заробку купляць калготкі. Зноў жа, той, хто вырас у СССР, памятае: грошы ў цябе ёсць, а калготкі так проста ў ГУМе не купіш, толькі калі «выкінуць» і яшчэ памарнаваўшы час у чарзе. І, мусіць, шматлікія жанчыны сярэдняга веку памятаюць той стрэс, калі калготкі парваліся ў самы непадыходзячы момант, а запасных у сумачцы няма. Цяпер вось радуюся, калі калготкі рвуцца: вельмі хочацца, каб шуфляда камоду з запасам, створаным за некалькі гадоў, хутчэй спустошвалася.

Дарэчы, не так ужо шмат знайшлося адзення, у якім мне некамфортна. Праўда, пакуль не ведаю, што рабіць з футрам, якое гадоў восем не апранала: зімы ўжо не тыя. Але, можа, хто на «Куфары» зацікавіцца.

Вынікі рэвізіі: пасцельная бялізна спатрэбіцца ў якасці падарунка сяброўцы, у якой пасля рэканструкцыі лецішча з'явіліся свае пакоі ў дзяцей-падлеткаў. Ношанае адзенне ў прыстойным стане аддам з рук у рукі тым, каму яно цяпер патрэбна. Асабліва пасля таго, як у адным манастыры мне сказалі, што сёння маламаёмасныя грамадзяне не жадаюць браць рэчы, якія былі ва ўжыванні, а толькі практычна новыя. Калі што, то сярод маіх рэчаў не было заношаных і з рознымі дэфектамі. Усё, што страціла форму, ідзе ва ўтылізацыю.

У прынцыпе, лёгка расстаюся з рэчамі, таму што на месцы дзвюх надакучлівых сукенак з'яўляецца адна новая, што неяк адразу паляпшае настрой. Даўно зразумела, што трымацца за старыя ці непатрэбныя рэчы — значыць абмяжоўваць сябе ў руху наперад.

«Хоць у старасці пафарсіла»

Мая прыяцелька Марына вельмі добра памятае, як яе бабуля запаўняла кухонныя шафікі бакалеяй. «Вось да гэтага часу стаіць перад вачыма паліца, на якой бутэлек дваццаць алею. У шафе — запасы адрэзаў тканін, пасцельнай бялізны, — успамінае Марына. — Атрымаўшы першы заробак, па дарозе дадому ўбачыла чаргу з вуліцы ў гаспадарчы магазін. Прадавалі вельмі прыгожыя талеркі вытворчасці Рыжскага фарфоравага завода. Я набыла дванаццаць штук. Мама схавала іх у кладоўку, маўляў, выйдзеш замуж, будзеш карыстацца ў сваёй сям'і. А я не разумела, чаму нельга цяпер, бо ў нас на кухні амаль увесь посуд то ў сколах, то ў расколінах. Вось калі прыходзілі госці, то выстаўляўся «парадны» сервіз. Амаль усе мае пакупкі мама складвала на потым. Часам даходзіла да сварак, бо хацелася модна апранацца цяпер, карыстацца прыгожай па мерках таго часу пасцельнай бялізнай».

Марына смяецца, што, калі надышоў час ёй выходзіць замуж, добрым пасагам лічыліся ўжо не сервізы і дываны, а нерухомасць і рахунак у банку.

Даўно зразумела, што трымацца за старыя ці непатрэбныя рэчы — значыць абмяжоўваць сябе ў руху наперад.

«Цяпер, з вышыні пражытых гадоў, прачытаных кніг, я разумею бабулю: юнацтва ў акупаваным горадзе, пасляваенныя зусім не сытыя гады. Вядома, быў страх зноў застацца галоднай, босай, таму рабіліся запасы «на чорны дзень». Мама ўзяла прыклад з бабулі, і толькі маё пакаленне змагло пазбавіцца ад гэтага страху. Мама кажа, што мы больш эгаістычныя, жывём адным днём. А колькі мне каштавала ўгаварыць яе насіць новыя рэчы, якія я ёй дарыла: «Мама, апранай цяпер, іншага жыцця не будзе». Яна ўспрымала мае парады так, быццам я яе ўжо хаваю. Гэта было гадоў дзесяць таму, а ў 70 яна мне сказала: «Дзякуй табе, хоць у старасці пафарсіла».

Для каго апранацца?..

Людміла лічыць, што цяпер — цудоўны час: столькі ўсяго можна купіць на распродажах, па скідках. У яе поўна ўсякага хатняга начыння, якое чакае сваёй гадзіны. У планах — рамонт кватэры, і вось тады... А яшчэ — чарговае замужжа. І вось тады яна будзе насіць пеньюары, прыгожую бялізну. Пакуль усё гэта проста з цэннікамі ляжыць у шафе. У ім жа вісіць з дзясятак святочных сукенак, набытых на карпаратыў або чыйсьці дзень нараджэння. На паліцах шафы звалена паўсядзённае, на «градацыі» Люды, адзенне, якое выйшла з моды. Прадаць ці, крый божа, аддаць жанчына не хоча. Маўляў, што я, жабрачка, каб за капейкі прадаваць свае рэчы? Аддаць — таксама не варыянт: з рэчамі сыходзіць энергетыка гаспадыні, а яна ні з кім не мае намеру дзяліцца.

А вось Галіна, сястра Людмілы, лічыць інакш: «Купіла шторы на лецішча, павешу зараз, не буду чакаць рамонту». Тым не менш рамонт зрабілі, хоць і не так хутка, як хацелася. І ў новы інтэр'ер жанчына купіла іншыя, больш прыдатныя да яго занавескі. Галіна вельмі крытыкуе Людмілу за сіндром адкладзенага жыцця. Кажа: «Жанчына можа хадзіць у старой сукенцы, але калі пад ім надзета прыгожая бялізна, то яна адчувае сябе каралевай». Але Людміла стаіць на сваім: «Вось калі мне будзе для каго адзяваць...» Для сябе яна не гатова прыгожа апранацца. Значыць, у яе выпадку яшчэ адна прычына «бераклівасці» — нелюбоў да сябе, жанчына нібыта не заслугоўвае прыгожых рэчаў.

Гатовы пазбаўляцца ад лішняга? Вы ў парадку!

«Усе мы родам з дзяцінства. Сфарміраваныя бацькамі псіхалагічныя ўстаноўкі напрамую адбіваюцца на нашым стылі мыслення, мадэлі паводзін і рэагавання. Мы прывыкаем думаць, дзейнічаць, прымаць рашэнні па звыклай схеме, бо стэрэатыпныя дзеянні не перагружаюць псіхіку і чалавеку прасцей жыць, слепа прытрымліваючыся гатовых узораў паводзін, — кажа **сямейны псіхолаг Таццяна ШАРАНДА.** — Само па сабе шаблоннае мысленне не добрае, не дрэннае і прысутнічае ў кожнага — пытанне толькі ў тым, які працэнт займае ў свядомых дзеяннях чалавека. Жыццё на навязаных узорах можа прывесці да фарміравання дэструктыўнага сцэнарыя, вынікам якога могуць быць сур'ёзныя асобасныя змены і псіхічныя засмучэнні».

Спецыяліст сцвярджае, што пакуль чалавек усведамляе, што захламленне прыносіць яму фізічны і эмацыянальны дыскамфорт і ён сам імкнецца пазбавіцца ад празмернага загрувашчвання, трывожыцца не варта. Бо не сакрэт, што страх голаду як праграма закладзены ў чалавека на генетычным узроўні. У такім выпадку выкінуць лішнія рэчы — значыць, магчыма, пагоршыць якасць жыцця. Калі чалавек імкнецца пераадолець гэты ірацыянальны страх, то такое захворванне, як паталагічнае назапашванне, яму не пагражае.

«Сіндром Плюшкіна (хоардынг) — псіхічнае захворванне, якое пачынае праяўляцца з таго, што чалавек без разбору купляе, назапашвае, прымае ў дар велізарную колькасць рэчаў, якія, на яго думку, з'яўляюцца неабходнымі ў дадзены момант або будуць такімі пазней, — тлумачыць псіхолаг. — Паступова чалавек абрастае хламам не толькі фізічна, але і псіхалагічна. Змяняецца характар, адносіны з навакольнымі пагаршаюцца настолькі, што ён становіцца ва ўсіх сэнсах адзінокім, яго каштоўнасную шкалу ніхто не прымае і, больш за тое, яго асуджаюць.

Паводле статыстыкі, каля 2,5 % людзей ва ўсім свеце пакутуюць на паталагічнае назапашванне. Стартаваць сіндром Плюшкіна можа яшчэ з падлеткавага ўзросту, але найбольш актыўным становіцца па меры старэння чалавека. Таксама да групы рызыкі адносяцца адзінокія людзі ці тыя, хто нядаўна перажыў смерць блізкага».

Да асноўных прычын узнікнення хоардынгу можна аднесці псіхалагічныя фактары: асаблівасці выхавання («У нас няма грошай, трэба эканоміць»), няздольнасць да годнага самазабеспячэння (слабы кар'ерны рост), цяжкі асабісты жыццёвы вопыт (бацькоўская сям'я з нізкім узроўнем даходу), наяўнасць псіхічных расстройстваў, напрыклад, такога як сіндром дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасць, пеніяфобія (страх беднасці).

«Своечасова зразумець і ўсвядоміць, што залішняе назапашванне можа прывесці да пагаршэння якасці жыцця, да змены на асобасным узроўні, да развіцця псіхічных расстройстваў, значыць, узяць сябе пад кантроль: перасягнуць бар'ер надуманага страху галечы, раздаць рэчы, не апелюючы да страты энергіі; не будаваць паветраных замкаў у будучыні, а пачынаць жыць тут і цяпер, тым самым даючы сабе шанц на новае, цікавае, насычанае жыццё», — рэзюмуе Таццяна Шаранда.

Аддаць ці прадаць?

На запыт у інтэрнэце: «Куды аддаць непатрэбныя рэчы» адказаў вельмі шмат. Кожны можа выбраць прыдатны варыянт. Хтосьці давярае рэлігійным арганізацыям, Чырвонаму Крыжу, іншы хоча дапамагчы Асацыяцыі шматдзетных бацькоў ці Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Можна скарыстацца спецыяльнымі кантэйнерамі, якія стаяць на запраўках А-100, і прынесці туды адзенне, абутак, пасцельную бялізну, коўдры, сумкі, рукзакі і цацкі.

Калі ёсць жаданне і патрэба, то можна скарыстацца магчымасцю прадаць дыхтоўныя, але непатрэбныя рэчы. У Мінску самы знакамітыя ўніверсальны камісійны магазін знаходзіцца на Партызанскім праспекце. Тут можна знайсці ўсё: ад мэблі да відэльца. І трэба сказаць, што пакупнікоў хапае. Перш, чым адправіцца ў камісійную краму, стэлефануйцеся, удакладніце не толькі графік работы, але і ці прымуць вашы рэчы. Маюць значэнне сезон і наяўнасць месца ў гандлёвай зале для буйнагабарытных тавараў.

Яшчэ нядаўна ў продажы меліся спецыялізаваныя газеты бясплатных аб'яў. Цяпер і яны сышлі ў інтэрнэт. Але рэгіянальныя газеты даволі часта публікуюць аб'явы з рубрыкі «Куплю-прадам». Самая папулярная інтэрнэт-пляцоўка для гандлю з рук — kufar.by.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

АДРАСЫ, ДЗЕ ЎСТАНОЎЛЕНЫ КАНТЭЙНЕРЫ ДЛЯ ЗБОРУ АДЗЕННЯ

У Мінску іх можна знайсці на запраўцы А-100 па вуліцы Казіміраўскай, д. 39, па вуліцы Акадэмічнай, д. 34 і па вуліцы Баравой, д. 7.

У Гомелі: вул. Матросава, д. 6; вул. Свірыдава, д.1, к. 2; вул. Тэльмана, д. 39; вул. Станцыйная, д. 1 і практычна ва ўсіх райцэнтрах Гомельскай вобласці (падрабязней — redcross.by).

У Віцебску — вул. Праўды, д. 43, у Магілёве — пр-т Міру, д. 12. У Брэсцкай вобласці кантэйнеры для збору адзення ёсць у Маларыце (вул. Савецкая, д. 96), Жабінцы (вул. Кірава, д. 126), Высокім (вул. Савецкая, д. 80/1), Пружанах (вул. Лазо, д. 6), Кобрыне (вул. 700-годдзя Кобрына, д. 6) і Ляхавічах (вул. Чкалава, д. 6).

Патрэбны чыстае і без пашкоджанняў адзенне па сезоне, абутак (мужчынскі, жаночы, падлеткавы, дзіцячы), сумкі, заплечнікі, коўдры, посцілкі, пасцельная бялізна.

НЕБЯСПЕЧНЫЯ ГУЛЬНІ «ДРЭННЫХ ДАРОСЛЫХ»

Як зберагчы ад іх дзіця?

ДЗЕЦІ — адна з самых уразлівых катэгорый насельніцтва, якой патрэбна дадатковая абарона. Педафілія — палавая цяга да дзяцей. Па выніках адпаведных даследаванняў, такіх людзей каля 5 % ад колькасці ўсяго насельніцтва, што нямала. І 98 % з іх — мужчыны. Аб пагрозе педафіліі, мерах барацьбы з ёю і рэкамендацыях, як зберагчы дзіця ад злачынцы, — у гэтым артыкуле.

Пра што гавораць лічбы

Паводле статыстыкі, 50 спраў аб педафіліі раскрыты ў Мінску з пачатку 2024 года. Статыстыка дазваляе казаць аб тым, што сёння комплексны падыход прыносіць вынік. Дзякуючы мерам, што прымаюцца, колькасць злачынстваў знізілася больш як на 16 працэнтаў. Пры гэтым важна адзначыць, што колькасць ахвяр знізілася на 40 %.

У Мінску расце выяўляльнасць замахаў на палавую недатыкальнасць непаўналетніх. Як паведамілі ў органах унутраных спраў, за чатыры месяцы 2024 года было раскрыта 35 спраў, звязаных з педафіліяй. Для параўнання: за такі ж перыяд у 2023 годзе колькасць раскрытых спраў у дачыненні да педафілаў склала 20. Яшчэ 9 такіх злачынстваў раскрыта з 6 да 24 мая, калі ў Мінску, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях прайшоў асноўны этап рэгіянальнай спецпраграмы «Дзяцінства без гвалту».

Кожнае дзіця, у якога ёсць сродкі сувязі, мае магчымасць патэлефанаваць у 102 ці, напрыклад, звярнуцца ў чат-бот міліцыі.

Праваахоўнікі адзначылі, што кожны трэці выпадак дамагання ў Мінску рабілі «прыяцелі па перапісцы» ў сацсетках пры наступнай сустрэчы афлайн. У астатніх злачынствах былі замешаны члены сям'і ці свае дзіцяці, суседзі, сябры бацькоў, розныя настаўнікі і незнаёмцы.

40 % ад агульнай колькасці выяўленых злачынстваў — гэта палавыя зносіны з асобамі, якія не дасягнулі 16-гадовага ўзросту, больш за 25 % — гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару і больш за 30 % класіфікуюцца як распусныя дзеянні. «Калі раней мы фіксавалі, што ў агульнай колькасці пацярпелых каля 5-7 % — хлопчыкі, то цяпер сярод ахвяр педафілаў 40 % — хлопчыкі».

На сёння ў Беларусі прапрацоўваюцца такія заканадаўчыя ініцыятывы, як устанаўленне адказнасці не толькі за выраб і распаўсюджванне, але і за захоўванне дзіцячай парнаграфіі без мэты распаўсюджвання.

Нашто гэта трэба? Па-першае, спажывец дзіцячай парнаграфіі, нават калі ён больш нічога супрацьпраўнага пакуль не робіць, — гэта патэнцыяльны педафіл. Па-другое, ён саўдзельнік злачынства. Дзіця недзе знялі ў порна менавіта для яго. У шмат якіх краінах ужо існуе такі механізм.

Таксама ў Беларусі распрацаваны і зацверджаны клінічны пратакол, які змяшчае алгарытм лячэння педафіліі, у тым ліку з прымяненнем хімічнай кастрацыі. Пад гэтай працэдурай маецца на ўвазе выкарыстанне спецыяльных лекавых прэпаратаў для памяншэння сексуальнай цягі, кампульсіўных сексуальных фантазій і здольнасці да сексуальнай узбуджальнасці. Аднак толькі медыкі будуць вырашаць, якая катэгорыя хворых на педафілію мае патрэбу ў хімічнай кастрацыі, а каму дастаткова заняткаў з псіхолагам, каб скарэкціраваць свае сексуальныя прыхільнасці.

З 12 ліпеня 2024 года набылі сілу змены ў Крымінальным кодэксе, паводле якіх

злачынцаў з афіцыйным дыягназам «педафілія» будуць адпраўляць на прымусовае лячэнне. Таксама за такімі людзьмі будзе ўстаноўлены нагляд.

Дарэчы, чым раней выяўляецца педафілія, тым больш яна ўстойлівая на працягу жыцця. Цалкам пазбавіцца ад цягі да дзяцей практычна немагчыма, але істотна яе зменшыць — магчыма.

Судзімы, нежанаты, агрэсіўны...

Такім чынам, педафілія можа развівацца ў двух выпадках:

• дзіцячая траўма: перажыўшы гвалт, чалавек у дарослым узросце імітуе паводзіны гвалтаўніка.

• У выніку арганічных парушэнняў галаўнога мозгу. Распаўсюджаныя прычыны педафіліі: праблемы падчас цяжарнасці, сур'ёзныя захворванні і чэрапна-мазгавыя траўмы ва ўзросце да 13 гадоў. У кары мозгу ёсць нейронная сетка, якая адказвае за выбар сексуальнага аб'екта. У педафілаў парушана распазнанне патэнцыяльнага палавога партнёра.

Паводле статыстыкі, сацыяльны партрэт педафіла выглядае наступным чынам: раней судзімы, мае сярэднюю спецыяльную адукацыю. Гэта чалавек нежанаты або разведзены. Мае агульныя працоўныя спецыяльнасці.

Чаму ад дзеянняў педафілаў пакутуюць дзеці? Часцей за ўсё за гвалтам стаіць жаданне ўлады і выплеск агрэсіі, бо дзеці слабыя і бездапаможныя перад дарослымі.

Большасць выпадкаў гвалту дзяцей здзяйсняюць увогуле «звычайныя» людзі. Часта ў стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення.

Часцей за ўсё ахвярамі педафілаў становяцца дзеці з:

• неўладкаваных сем'яў;

• абдзеленыя ўвагай.

Як засцерагчы сваё дзіця ад зносін з педафілам?

• Найбольш эфектыўная мера — звычайнае інфармаванне дзіцяці аб магчымай небяспецы.

• Дзіцяці важна дакладна ведаць: дарослы чалавек не папросіць дапамогі ў малога!

Як расказаць дзіцяці пра педафіла? Да 10 гадоў можна не даваць фармулёўку «педафіл», а зваць такога чалавека «дрэнным дарослым».

Паведаміце дзіцяці:

• педафіл — гэта чалавек, які хварэе, таму паводзіць сябе няправільна, але гэта яго не апраўдвае. Такі чалавек можа трымаць рукі на інтымных месцах, і калі такога ўбачыш — адыдзі далей і паспяшайся расказаць бацькам.

• Ён знаёміцца з дзецьмі на вуліцы ці ў інтэрнэце.

• Педафілу падабаецца глядзець і чапаць распранутых дзяцей, асабліва ў інтымных месцах. Гэта прыносіць яму задавальненне.

• Педафіл можа фатаграфаваць ці здымаць відэа з удзелам распранутых дзяцей. Просіць нешта рабіць на камеру. Можа за гэта паабяцаць нейкае ўзнагароджанне.

• Яму падабаецца паказваць свае інтымныя месцы дзецям.

Кожнае пятае пацярпелае дзіця пражывала ў няпоўнай сям'і. Звычайна — з маці.

Рэзанансны выпадак адбыўся 21 чэрвеня 2024 года ў Магілёўскай вобласці, калі быў затрыманы педафіл. З заявай аб дамаганнях суседа да малалетняй дачкі ў міліцыю звярнулася жыхарка аднаго з райцэнтраў, паведамілі ва УУС Магілёўскага аблвыканкама. 19-гадовы фігурант часта прыходзіў у сям'ю, каб дапамагчы па гаспадарцы шматдзетнай маці-адзіночцы. У адзін з такіх візітаў жанчына ўвайшла ў пакой і ўбачыла суседа ў момант учынення злачынства. Высветлілася, што мужчына на працягу паўгода неаднаразова адасабляўся з 7-гадовай дзяўчынкай. Падазроны затрыманы следчымі, заведзена крымінальная справа за гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару ў дачыненні да заведама малалетняй. Яму пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

• Ён можа прасіць рабіць тое, што яму падабаецца, і пагражаць пры гэтым тваім родным.

• Ён абавязкова будзе прасіць дзіця нікому нічога не расказваць, інакш выканае пагрозы.

• Ён ведае, што яго дзеянні дрэнныя і незаконныя, але ўсё роўна гэта робіць.

Тэрмінова паведаміць быцькам!

Часам бывае, што людзі, якіх мы ведаем (дзядзькі, цёткі, суседзі, сваякі), таксама пачынаюць хварэць на такое. Калі ў малога ўзнікне падазрэнне — неабходна паведаміць бацькам.

Раскажыце дзіцяці, што вы ніколі не будзеце на яго лаяцца, калі яно несвоечасова распазнае педафіла і нават мела зносіны з ім нейкі час. Таксама, калі ў дзіцяці з'явіцца падазрэнне, што нейкі чалавек — педафіл, неабходна тэрмінова паведаміць бацькам.

Дарослым! Для пачатку трэба ўсвядоміць пагрозу таго, што дзіця можа стаць ахвярай педафіла ў любы момант: на вуліцы, у інтэрнэце ці ў іншым месцы. Таму, калі яно маленькае, не прамымі словамі, а ў форме казачнага апавядання, у гульнявой форме трэба тлумачыць яму, што ёсць злыдні, якія спрабуюць рабіць нешта нядобрае з дзецьмі, і трэба гэтых нягоднікаў баяцца. Не варта ўвогуле размаўляць з незнаёмымі людзьмі, не трэба ім давяраць, згаджацца на іх прапановы, якія б яны ні былі! Гэтаму трэба вучыць дзяцей.

Не варта ўвогуле размаўляць з незнаёмымі людзьмі, не трэба ім давяраць, згаджацца на іх прапановы, якія б яны ні былі! Гэтаму трэба вучыць дзяцей.

Таксама неабходна расказаць свайму дзіцяці, што:

• педафіл у адносінах з дзецьмі вельмі клапатлівы;

• імкнецца да фізічнага кантакту праз дакрананні. Як правіла, ён песціць дзяцей, увесь час хваліць іх, заслугоўвае давер;

• часта бавіць час каля дзіцячых пляцовак ці стараецца працаваць побач з дзецьмі.

Такія фактары, як ваша безумоўная любоў, давер, жыццярадаснасць, вольнае выказванне пачуццяў, упэўненасць у сабе і высокая самаацэнка, з вялікай доляй верагоднасці гарантуюць, што ваша дзіця практычна ніколі не падвергнецца гвалту.

Калі дзеці ўжо дастаткова падраслі, можна ім прама казаць, што існуюць педафілы, тлумачыць, што яны з сябе ўяўляюць:

• трэба вучыць дзяцей не садзіцца ў машыну з незнаёмымі людзьмі;

• не сыходзіць нікуды з вуліцы;

• не заходзіць з незнаёмцамі ў пад'езд, у ліфт, тым больш не пускаць іх у кватэру.

Навучыце дзяцей казаць «НЕ». Псіхолагі кажуць, што дзіця, нават усведамляючы, што адбываецца нешта нядобрае, пад псіхалагічным ціскам, напорам, нават без фізічнага гвалту згаджаецца, не знаходзіць у сабе сіл адмовіцца.

Інфармацыйная гігіена

Педафіла можна сустрэць у інтэрнэце. У цяперашні час інтэрнэт уяўляе сур'ёзную пагрозу ў сферы палавой свабоды і недатыкальнасці непаўналетніх. Дзеці там увесь час «сядзяць», яны маюць зносіны, наведваюць розныя чаты і сайты. З пэўнага ўзросту кантроль з боку бацькоў слабее. І ў інтэрнэце з імі знаёмяцца педафілы. Яны звычайна выдаюць сябе за дзіця.

Зламыснікі ўступаюць з дзіцем у даверлівыя адносіны. Далей ідуць псіхалагічныя маніпуляцыі, вывудзванне нейкай кампраметавальнай інфармацыі, інтымных фатаграфій і, як правіла, шантаж. Пагражаюць перадаць гэтую інфармацыю бацькам, блізкім ці аднакласнікам, калі дзіця не будзе выконваць патрабаванні злачынца.

Фота: pexels.com

Навучыце дзяцей правільным паводзінам.

• Для пачатку — інфармацыйнай гігіене. Каб злачынцы не завалодвалі данымі, рэальнымі фатаграфіямі, месцам пражывання і гэтак далей. Гэта ўсё інструменты маніпуляцый.

• Трэба навучыцца банальна закрываць свае старонкі ў сацыяльных сетках. Не ўступаць у перапіскі з тымі, хто выклікае падазрэнні. Калі дзіця бачыць, што перапіска ідзе не ў тое рэчышча, яе трэба спыняць і паведамляць бацькам. Каб бацькі потым пайшлі ў міліцыю, якая зойме цца гэтым чалавекам, знойдзе яго і выратуе іншых дзяцей.

Навучыце дзіця: калі ж злачынства ўсё ж здзяйсняецца, то трэба аказваць супраціўленне, вырывацца, крычаць. Незалежна ад таго, ці ўдалося пазбегнуць гвалту, ці ён ужо адбыўся, трэба пра ўсё паведаміць дарослым. Калі няма побач бацькоў, няма магчымасці ім патэлефанаваць, трэба расказаць пра тое, што здарылася, любому дарослому, які выклікае давер. Таксама кожнае дзіця, у якога ёсць сродкі сувязі, мае магчымасць патэлефанаваць у 102 ці, напрыклад, звярнуцца ў чат-бот міліцыі.

Галоўнае — не баяцца ісці далей. Трэба разумець, што любы выпадак сексуальнага гвалту ніколі не пройдзе сам сабой. Трэба атрымаць дапамогу. Па-першае, ахвяры неабходна дапамога псіхолага. Па-другое, злачынца трэба затрымаць і ізаляваць ад грамадства. Толькі тады гэты выпадак будзе па-сапраўднаму закрыты.

Важна адзначыць, што Савет Міністраў зацвярджае планы мерапрыемстваў па абароне дзяцей ад сексуальнага гвалту і эксплуатацыі. Акрамя таго, у краіне створаны нацыянальны механізм аказання дапамогі пацярпелым ад сексуальнага гвалту.

Алена ШАЎЧЭНКА, псіхолаг.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. Тел. +375 17 310-36-37
Продавец	Слонимский районный центр для обеспечения деятельности учреждений сферы образования», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, 40
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, пом. 5. Тел. +375 17 373-21-33. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by
Предмет электронных торгов: ЛЕГКОВОЙ СПЕЦИАЛЬНЫЙ СЕДАН (SEDAN) CHEVROLET LACETTI, р/зн. 6575 ЕВ-4, № кузова KL1NF197J8K909632, 2008 г. в., по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, 40. **Начальная цена лота (без НДС) – 7 500,00 бел. рублей.** Шаг торгов – 375,00 бел. рублей	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 07.10.2024. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **04.10.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by) от 05.09.2024 г.	
Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by	

Извещение о проведении (повторных) электронных торгов

Открытое акционерное общество
Оршанский станкостроительный завод
«Красный борец»

23101605 извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ему на праве собственности.

Номер лота,
вид выставляемого на электронные торги имущества: № 81098, Недвижимость/Здания офисного назначения.

Информация о предмете электронных торгов, в том числе местонахождение:

изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-187370, площадью 115,5 кв. м;
назначение: административное помещение;
наименование – встроенное служебное помещение бюро проектирования, местонахождение:
Витебская обл, г. Витебск, ул. Берестеня, 7-42.

Начальная цена: 125280,00 белорусских рублей.
Минимальная цена: 125280,00 белорусских рублей.
Размер шага составляет 5 процентов от 125280,00 (*начальной цены)*.
Имеющиеся обременения в отношении имущества: обременения отсутствуют.
Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 26.09.2024 09.00 до 26.09.2024 16.00.
Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Единая система электронных торгов (*наименование оператора электронной торговой площадки*) по электронному адресу: https://torgi.gov.by.
Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: https://torgi.gov.by/lot/81098/18527/izolirovannoe-pomeshenie-s-inventarnym-nomerom-200-d-187370-ploshad-115-5-kv-m-naznachenie-administrativnoe-pomeshenie-naimenovanie-vstroennoe-sluzhebnoe-pomeshenie-byuro-proektirovaniya, необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 26.09.2024 09.00.
Задаток в сумме 12528,00 белорусских рублей должен быть зачислен на счет:

Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»	
Адрес	г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513
тел.	200-95-63, 200-73-33, 200-64-11
УНП	190318109
р/с	BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ»
БИК	BELBBY2X

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 30 дней со дня завершения электронных торгов.
Справочная информация:
контактный телефон продавца имущества 375295297782 (Лухтеева Наталья Игнатьевна (*дата, время доступа (ознакомления) с предметом торгов осуществляется по предварительному согласованию с организатором торгов* (***контактное лицо: Бабурченков Павел Геннадьевич, тел. +375 29 5107651***)).
Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют 5 % или менее в зависимости от конечной цены за лот согласно прейскуранту https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.pdf
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

Извещение о проведении (повторных) электронных торгов

Открыток акционерное общество
Оршанский станкостроительный завод
«Красный борец»

23101605 извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего обществу на праве собственности:

КОМПЛЕКС ЗДАНИЙ
с неотъемлемыми частями и принадлежностями:
здание магазина «Сигма»,
рег. № 240/С-19012, общ. пл. 251,3 м²;
здание кафе «Берёзка»,
рег. № 240/С-19011, общ. пл. 768,7 м²;
расположенный по адресу:
Витебская обл, г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 19.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества: № 81099, Недвижимость/Прочее.
Информация о предмете электронных торгов, в том числе местонахождение: Витебская обл, г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 19.
Начальная цена: 450431,05 белорусских рублей.
Минимальная цена: 450431,05 белорусских рублей.
Размер шага составляет 5 процентов от 450431,05 (*начальной цены лота*).
Имеющиеся обременения в отношении имущества: обременения отсутствуют.
Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 26.09.2024 09.00 до 26.09.2024 16.00.
Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Единая система электронных торгов по электронному адресу: https://torgi.gov.by.
Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: https://torgi.gov.by/lot/81099/18528/kompleks-zdanij-, необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 26.09.2024 09.00.
Задаток в сумме 45043,11 белорусских рублей должен быть зачислен на счет:

Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»	
Адрес	г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513
тел.	200-95-63, 200-73-33, 200-64-11
УНП	190318109
р/с	BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ»
БИК	BELBBY2X

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 30 дней со дня завершения электронных торгов.
Справочная информация:
контактный телефон продавца имущества +375295297782 (*дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов осуществляется по предварительному согласованию с организатором торгов (контактное лицо* ***Салдунова Светлана Борисовна,*** *тел. +375291133643)*).
Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют 5 % или менее в зависимости от конечной цены за лот согласно прейскуранту https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.pdf
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

ИЗМЕНЕНИЕ И ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

государственного предприятия «Управление капитального строительства Запад»

по жилому дому № 4 в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр. Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)»,
опубликованной в газете «Звязда» 21.03.2023

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.
Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.
Офис продаж: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.
Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг с 08.30 до 17.30, пятница с 08.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.
Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам предлагается для заключения договора создания объектов долевого строительства **двухкомнатная квартира**, расположенная на 7 этаже жилого дома № 4 (по генплану) общей площадью 69,56 кв. м, стоимостью 1 кв. метра 4 550,00 белорусских рублей.
Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются **встроенные нежилые помещения:**

№ п/п	Назначение помещения	Общая площадь, кв. м	Секция жилого дома	Этаж	Стоимость 1 кв. м общей площади, руб.
1	Торгово-административное	101,81	1	1	8 500,00
2	Торгово-административное	115,48	1	1	8 900,00
3	Торгово-административное	96,52	1	1	8 900,00
4	Пункт приема в химчистку	47,35	2	подвал	4 500,00
5	Творческая мастерская	47,67	2	подвал	4 500,00
6	Пункт приема цифровой техники в ремонт	14,69	2	подвал	5 400,00
7	Творческая мастерская	47,09	1	подвал	4 500,00
8	Творческая мастерская	49,00	1	подвал	4 500,00

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере 30 % от стоимости договора в течение 10 (десяти) календарных дней с даты регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе, оставшаяся сумма – по графику платежей.
